ЗАЎТРА АДКРЫВАЕЦЦА XVIII З'ЕЗД ВКП(б). ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАННЕ З'ЕЗДУ!

ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЧАЦВЕР, 9 САКАВІКА 1939 г. № 13 (427)

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў БССР



ЗА НОВЫЯ ПЕРАМОГІ КОМУНІЗМА

Гераічны рускі народ, народы вялікага Совецкага Саюза з нецярплівасцю чакаюць адкрыцця XVIII з'езда ВКП(б).

Партыя, рабочы клас, калгаснае сялянства, інтэлігенцыя, уся наша краіна, пролетарыі ўсяго свету з нецярплівасцю чакаюць выступлення на з'ездзе генія чалавецтва — Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна, які падагуліць сусветна-гістарычныя перамогі працоўных СССР у справе пабудовы соцыялізма, як прарок загляне ў вякі, акрэсліць далейшыя шляхі к комунізму.

На XVIII з'ездзе ВКП(б) будзе абмеркаван і прынят грандыёзны план трэцяй пяцігодкі, накрэслены ў тэзісах главы совецкага ўрада — тав. В. М. Молатава, будуць абмеркаваны і прыняты тэзісы даклада тав. А. А. Жданава аб зменах у статуце ВКП(б).

Наша партыя ідзе к свайму з'езду згуртаванай як ніколі вакол Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), вакол вялікага Сталіна, — ідзе маналітнай, непераможнай сілай.

Партыя Леніна—Сталіна дабілася росквіту эканомікі і культуры нашай краіны таму, што яна з'яўлялася і з'яўляецца партыяй рэволюцыйнай, партыяй перадавой, непрымірымай да ўсялякага роду згоднікаў і капітулянтаў, бязлітаснай да ўсялякага роду ворагаў народа.

Комуністычная партыя паслядоўна праводзіла і праводзіць у жыццё вялікае вучэнне Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна. Развіваючы марксісцка-ленінскую навуку, партыя атрымоўвала перамогу за перамогай.

Большэвікі заўсёды трымалі і трымаюць самую цесную і кроўную сувязь з працоўнымі масамі. Яны вучыліся і вучацца ў мас, яны вучылі і вучаць масы. Працоўныя масы заўсёды лічылі і лічаць большэвікоў адзінымі выразіцелямі іх дум.

Народ даўно марыў пазбыцца няволі і пакут, знішчыць ярмо прыгнёту, разбіць кайданы царызма, раз і назаўсёды знішчыць падзел грамадства на эксплаататараў і эксплаатыруемых. Комуністычная партыя, ведаючы інтарэсы працоўных, узначаліла іх барацьбу супроць прыгнятальнікаў. Звергнуўшы ўладу капіталістаў і памешчыкаў, працоўныя СССР пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі пабудавалі соцыялізм, знішчылі эксплаатацыю чалавека чалавекам.

Цяпер заветнай марай працоўных з'яўляецца пабудова комуністычнага грамадства, дзе асноўным прынцыпам будзе «ад кожнага па яго здольнасцях, кожнаму па яго патрэбах». Падслухаўшы думы народныя, марылі аб гэтым лепшыя розумы чалавецтва — Маркс, Энгельс, Ленін. Комуністычная партыя, кіруемая вялікім Сталіным, узначаліла барацьбу совецкага народа за пабудову комунізма. Комунізм, не гледзячы ні на што, пераможа ва ўсім свеце!

Сёння кожны грамадзянін вялікай краіны соцыялізма прадумвае, як ён будзе ўдзельнічаць у пабудове комунізма. Прадумвае гэта пытанне і наш правадыр. Заўтра лепшыя абраннікі нашай партыі, а разам з імі і ўся краіна, увесь свет пачуюць простыя і мудрыя словы таварыша Сталіна, якія, як сонца, асвецяць шлях к комунізму.

Разам з усім народам прадумваюць пытанне аб сваім удзеле ў пабудове комунізма і нашы літаратары, мастакі і артысты. Пачэсная іх роля! Іх тонкі інструмент — мастацкае слова, акрамя задачы арганізацыі разумовага адпачынку, мае сваёй мэтай адшліфоўку душ чалавечых. Капіталізм налажыў глыбокі адбітак на псіхіку чалавека. Перамаганне перажыткаў капіталізма ў жыцці і свядомасці людзей — вось над чым будуць працаваць мастакі слова і кісці, акторы і музыканты, дапамагаючы нашай партыі ў яе сусветна-гістарычнай рабоце — пабудове комунізма.

Фашысты ў сваёй звярынай нянавісці к Совецкаму Саюзу ўвесь час точаць зубы на нашу краіну. Партыя, вялікі Сталін вызначаць далейшыя мерапрыемствы па ўмацаванню абароназдольнасці першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы.

За годы двух сталінскіх пяцігодак наша краіна стала непазнавальнай. Асабліва выраслі нацыянальныя рэспублікі, якія раней прыгняталіся. Вырас рабочы клас, калгаснае сялянства, інтэлігенцыя. Расцвіла эканоміка і культура Совецкай Беларусі.

У трэцяй пяцігодцы нацыянальныя рэспублікі яшчэ шпарчэй пойдуць наперад, развіваючы сваю прамысловасць, сельскую гаспадарку, ствараючы сваю культуру—нацыянальную па форме і соцыялістычную па свайму зместу.

За далейшыя перамогі комунізма!
Няхай жыве XVIII з'езд ВКП(б)!
Слава вялікаму Сталіну!

ТВОРЧЫЯ ПАДАРУНКІ XVIII З'ЕЗДУ ВКП(б)

СКУЛЬПТУРА „ЗОДЧЫ“

У дні з'езда скульптар Бразэр заканчвае вялікую манументальную фігуру таварыша Сталіна — «Зодчы» — вышынёй у 2,5 метра. Фігура таварыша Сталіна робіць моцнае ўражанне. Выраз твару — мяккі, чалавечны, разам з тым ва ўсёй фігуры адчуваецца вялікая магутнасць. Апранут таварыш Сталін, як звычайна, скромна і проста — у расшпіленым летнім паліто, з нязменнай люлькай у руках.

Новая работа — выдатнае дасягненне скульптара Бразэра.

НОВЫЯ ПАСТАНОЎКІ

У дні работы XVIII з'езда ВКП(б) тэатры БССР выпускаюць новыя спектаклі. Тэатр оперы і балета 10 сакавіка пакажа гледачу першую беларускую оперу «Міхась Падгорны», Віцебскі драмтэатр у гэты-ж вечар выпускае прэм'еру «Генконсул» бр. Тур і Шэйніна, Менскі драмтэатр — «Генконсул», Тэатр юнага гледача — «Даходнае месца».

Лепельскі калгасна - соўгасны тэатр пакажа 10 сакавіка свой першы спектакль «Пагранічнікі» Біль-Белацэркоўскага. Лялечны тэатр 15 сакавіка пакажа юным гледачам «Казку пра папа і яго работніка Балду». Полацкі калгасна-соўгасны тэатр выпускае ў дні з'езда прэм'еру «Таня» Арбузова.

МАСТАЦКАЯ ВЫСТАЎКА Ў ГОМЕЛІ

У дні адкрыцця XVIII з'езда ВКП(б) у Гомелі адкрываецца першая абласная выстаўка работ мастакоў-прафесіяналаў і самавучак. Будзе выстаўлена каля 70 работ 16-ці мастакоў. Найбольшую цікавасць выклікае нядаўна закончаная карціна таленавітага гомельскага мастака Шэўчэнка на тэму аб заможным калгасным жыцці, а таксама рад нацюрмортаў і партрэт настаўніцы таго-ж мастака.

Мастакі Звенігародскі, Русецкі і Зорын напісалі карціны, прысвечаныя індустрыяльнаму Гомелю і калгасам вобласці. З работ самавучак трэба адзначыць рад партрэтаў і нацюрмортаў маладога настаўніка-біёлага Раскіна. Асабліва цікавая яго работа — партрэт пажылой жанчыны. Будуць таксама выстаўлены работы вядомага скульптара-самавучкі Паварыча і скульптара—дэмабілізаванага чырвонаармейца Чэрняка, якога камандаванне Н-скай часці і рад майстроў рэкамендуюць накіраваць у Акадэмію мастацтваў. З работ тав. Чэрняка асабліва вылучаецца бронзавы бюст стаханаўца Гомсельмаша, рад малюнкаў з быту Чырвонай Арміі.

НОВАЯ ПРАГРАМА АНСАМБЛЯ ПЕСНІ І ПЛЯСКІ ФІЛАРМОНІІ

Ансамбль песні і пляскі Дзяржфілармоніі БССР закончыў работу над новай праграмай. Праграма ўключае 6 новых песень і рад танцаў. Асабліва трэба адзначыць песню аб Леніне і Сталіне «Дарожанька» — муз. Захарава, песню «Шаўковы паясок» — тэкст Клімковіча, муз. Любана, плясавую «Таксяк мне да вечара дажыць»—у апрацоўцы Цікоцкага, хараводную Сакалоўскага, частушкі аб Варашылаве — муз. Туранкова. Частушкі выконваюцца ў суправаджэнні яркай чырвонаармейскай пляскі ў пастаноўцы Алексютовіча.


Сярод танцаў асабліва вылучаецца ўпершыню пастаўлены сольны пастушачы танец «Бычок» — пастаноўка Алексютовіча, музыка Сакалоўскага. У праграме таксама—старажытная сольная песня «Ці я ў цябе, мой ты татухна»—у апрацоўцы Любана. Песню выконвае артыстка ансамбля Таня Аўрамчык.

АДКРЫЦЦЁ ВЯЛІКАГА ТЭАТРА ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР

10 сакавіка, у дзень адкрыцця XVIII з'езда ВКП(б), уступае ў эксплаатацыю Дзяржаўны Вялікі тэатр оперы і балета БССР. Аб'ём будынка 163 тыс. куб. метраў, кошт яго — 12.410 тыс. руб.

У дзень адкрыцця тэатра будзе пастаўлена першая беларуская совецкая опера «Міхась Падгорны» — лібрэта пісьменніка-ордэнаносца Пятруся Броўкі, музыка кампазітара Цікоцкага; пастаноўка засл. арт. рэсп. Літвінава.

У гэтым-жа будынку размешчана рэспубліканскае тэатральнае вучылішча.



НА ЗДЫМКУ: Агульны выгляд Тэатра оперы і балета БССР. Фота Каплінскага.

ЯНКА КУПАЛА

ШЛЯХІ

XVIII з'езду партыі большэвікоў

З Масквы, з Крэмля на ўсе староны
Ляглі шляхі святлом усланы,
Па іх ідуць, ідуць мільёны
Людзей магутных, гордых, вольных,
Ідуць мільёны раскаваных.

Абапал — гарады і сёлы
У садах квяцістых, пладаносных,
У кветках нівы, горы, долы,
Шуміць вяселлем дзень вясёлы,
Шуміць людзям аб вечных вёснах

Абапал — рэкі і азёры,
Па новых рэкі ходзяць ходах,
Да Балцікі скрозь даль прастораў
Шлях Белае прасекла мора,
Здружылі моры свае воды.

Абняўшыся, як дзве сястрыцы,
Масква-рака і Волга шумам
Збіраюць да сябе крыніцы —
Усе з жыватворнаю вадзіцай —
І шумам будзяць, песцяць думы

Дняпро і Тэрэк хоць далёкі —
Здружылі з Волгай многаводнай.
А быў да дружбы шлях не лёгкі,
Пакуль шлях новы лёг вясёлкай,
Крэмлёўскай зоркай пуцяводнай.

Ідуць мільёны. Шлях не скрывіць
Ні ўсходні вецер, ні заходні:
Усходы буйныя на ніве
Азнакай на шляху шчаслівай,
Чырвоны ў сонцы сцяг паходняй.

Шляхі, шляхі зямлі радзімай!
О, колькі песень з сэрца рвецца!
Мінуліся ліхія зімы,
Другія зоры прад вачыма,
І па-другому б'ецца сэрца.

Масціў шляхі вялікі Ленін,
Шляхі шчасліваць мудры Сталін,
Каб з пакалення ў пакаленне
Людское з путаў вызваленне
У прамяністыя йшло далі.

З Масквы, з Крэмля хадою ўдумнай,
Усенароднай, чалавечай,
Праз поле, поплавы, буруны
Ідзе, таварышы, комуна
На свеце шчасце ўвекавечыць!

Менск, 3. III. 39.

ЦІМ. КРЫСЬКО

ПАВЕРКА

Б'е гадзіннік дванаццаць. І сусвет неабдымны
Ловіць з прагнасцю кожнае слова Крэмля.
Устае у натхнёным, у велічным гімне
Неабсяжная наша зямля.

Дзе ты, дружа, урачыстаю гэтай гадзінай:
У пагранічны дазор на пачэсную вахту ідзеш,
Размаўляеш з Масквою з паўночнай ільдзіны,
У дальні рэйс самалёт свой вядзеш?

А то, можа, у чужых, у разгневаных водах
За тваім караблём сочыць хцівы пірат?
Пэўны ты, дужы сілай, нязломнаю сілай народа,
Хай руку толькі ўзніме карычневы гад...

Бо куды-б не пайшоў ты, куды-б ні паехаў,
Табе ўсюды радзіма нясхісную дужасць дае.
У няшчасці пачуеш ты цёплае слова уцехі,
У шчасці — шчырую радасць яе.

Дзе-б ні быў, ты ўстанеш ў парыве адзіным,
У магутнай сям'і слаўных мужных сыноў,
Адусюль ты пачуеш голас маці-радзімы,
Усё аддаўшай табе—ласку, шчырасць, любоў.

Ты устанеш з усімі, бо ў гэта імгненне
Мы не толькі звяраем гадзіннікаў ход,
Мы еднаем пачуцці, упэўненасць, сілу, натхненне,—
З сэрцам Сталіна сэрцы еднае народ.

ВЯЛІКІ ПАЭТ

Сто дваццаць пяць год назад, 9 сакавіка 1814 года, у сям'і прыгоннага селяніна нарадзіўся вялікі украінскі паэт-рэволюцыянер Тарас Грыгоравіч Шэўчэнка. Сын народа, выхадзец з самых гаротных і абяздоленых яго нізоў, Тарас Грыгоравіч чулай душой паэта ўбіраў у сябе ўсю крыўду, увесь гнеў і пратэст прыгоннага сялянства, прыдаўленага панамі і царскімі чыноўнікамі. У паэме «Каўказ» Шэўчэнка гаворыць, што ён бачыў столькі крыві і слёз, што «напоїть всіх імператорів би стало—з дітьми і внуками».

Крыніцай творчасці Шэўчэнка была яго невычарпальная любоў да народа, яго гнеўная нянавісць к «царам і царатам», яго пратэст супроць сваволля польскіх, украінскіх, рускіх паноў. Паэт бачыў, як спякотлівым днём паміраюць пад тынам апухлыя ад голаду дзеці ў той час, калі маці жне на паншчыне чужую пшаніцу; ён чуў, як стогнуць у царскіх казармах сыны украінскай вёскі. На вачах у паэта распіналі за падаткі ўдоў і сірот царскія чыноўнікі. Усё прыкмячаў паэт, усё адкладвалася ў яго памяці, каб потым пераўтварыцца ў гнеўныя песні.

Вялікі кабзар разумеў, што не рэформы прасіць трэба зверху, не лізаць руку, якая катуе народ, а «громадою обух сталить, та добре вигострить сокиру», каб раз назаўсёды расправіцца з прыгнятальнікамі. Сіла і значэнне паэта, яго народнасць, яго неўміручая слава ў першую чаргу і састаяць у тым, што геніяльнымі сваімі вершамі і паэмамі, усёй сваёй творчасцю змагаўся ён за самыя перадавыя ідэі і лозунгі свайго часу, што ён разам з вялікімі рускімі дэмакратамі Чэрнышэўскім і Дабралюбавым расхістваў асновы царскага ладу.

Царскія сатрапы ненавідзелі паэта. Яны ведалі, што яго вуснамі гаворыць сам народ, яны не маглі дараваць кабзару, што яго паэзія выклікала захапленне ў асяроддзі самых перадавых людзей Расіі. І на галаву паэта абрушваецца адна кара за другой — яго выганяюць з роднай Украіны і ссылаюць салдатам у далёкія кіргізскія стэпы «без права пісаць і маляваць». Ні на адну мінуту не пакідалі Тараса Грыгоравіча ў спакоі царскія жандары. Нават на смертным одры сваім быў ён пад наглядам паліцыі. Але, хоць царызм налажыў сваю лапу на самае горла песняра, ён не скарыўся. Голас вялікага кабзара, заглушаючы звон ланцугоў, далятаў у сёлы, гарады, мястэчкі Украіны і будзіў, узнімаў, клікаў на бойку з панамі прыгнечаны народ. Апяваючы долю прыгоннага украінскага сялянства, Тарас Шэўчэнка знаходзіў словы любві і шчырасці да народаў Каўказа, да кіргізаў, да ўсіх тых, хто прагнуў волі і змагаўся за яе. Яго песні, па словах самога паэта, былі накіраваны да ўсіх народаў, «ад малдаваніна да фінна».

Надзея на вызваленне свайго народа ніколі не пакідала Шэўчэнка, ніколі не згасала яго вера ў перамогу працоўных над прыгнятальнікамі. Ён марыў пра той час, калі народ у вольнай сям'і ўспамяне яго добрым словам. Гэты час наступіў. У вольнай сям'і совецкіх рэспублік імя Тараса Грыгоравіча карыстаецца найвялікшай любоўю і пашанай. Яго думы і песні сталі здабыткам шчаслівых совецкіх людзей і аднолькава гучаць па ўсёй краіне, на мовах усіх народаў Совецкага Саюза.

Совецкі народ любіць Шэўчэнка за рэволюцыйную страснасць яго вершаў і дум, за іх народнасць, і шчырасць, за іх баявы інтэрнацыяналізм. Паэты ўсіх совецкіх рэспублік вучацца ў славутага кабзара любіць сваю радзіму і ненавідзець яе ворагаў, вучацца шчырасці верша, майстэрству, пявучасці рытму. Кожны паэт лічыў для сябе гонарам працаваць над перакладамі вершаў Шэўчэнка на мову сваёй рэспублікі. Брыгада беларускіх пісьменнікаў у дні падрыхтоўкі да юбілея Шэўчэнка паднесла беларускаму народу вялікі падарунак — увесь «Кабзар» перакладзен на беларускую мову.

Юбілей геніяльнага украінскага паэта Тараса Грыгоравіча Шэўчэнка стаў святам для ўсіх народаў СССР. Імя вялікага кабзара будзе жыць у вяках, яго вершы і думы будуць вечна хваляваць, клікаць на барацьбу народы нашай радзімы.

УЗНАГАРОДЖАННЕ СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ УССР

За выдатныя поспехі і дасягненні ў развіцці совецкай мастацкай літаратуры Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 5 сакавіка г. г. узнагароджаны 8 пісьменнікаў Совецкай Украіны. Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга ўзнагароджаны т. т. **І. А. Качэрга** і **І. Л. Ле**. Ордэнам «Знак Почета» узнагароджаны т. т. **А. Г. Дзесняк, А. С. Малышка, М. П. Мітранец, М. С. Тардоў, О. Д. Іваненка** і **В. Н. Сосюра.**

В. В. БАРСАВА ПРЫНЯТА Ў ВКП(б)

Напярэдадні Міжнароднага жаночага дня, 7 сакавіка, адбыўся адкрыты партыйны сход калектыва Вялікага тэатра. Сход аднагалосна прыняў кандыдатам у члены ВКП(б) дэпутата Вярхоўнага Совета РСФСР, народную артыстку СССР В. В. Барсаву.

На тым-жа сходзе было прынята рашэнне аб пераводзе заслужанай артысткі РСФСР В. В. Крыгер з кандыдатаў у члены ВКП(б). (ТАСС).

125-ГОДДЗЕ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Т. Г. ШЭЎЧЭНКА

ШЭЎЧЭНКАЎСКІЯ ДНІ Ў КІЕВЕ

(Ад нашага спецыяльнага карэспандэнта).

На шэўчэнкаўскія ўрачыстасці ў Кіеў з'ехаліся дэлегацыі Грузіі, Узбекістана, Арменіі, Азербайджана, Абхазіі, Карэліі. У дэлегацыю ад Совецкай Беларусі ўваходзяць народныя паэты БССР ордэнаносцы Янка Купала і Якуб Колас, пісьменнікі-ордэнаносцы З. Бядуля і М. Лынькоў, паэт А. Куляшоў.

6 сакавіка ў 13 гадзін дня ў прысутнасці дзесяткаў тысяч працоўных у Кіеве адбылося адкрыццё помніка вялікаму украінскаму кабзару. На ўрачыстым адкрыцці помніка з прамовай выступіў сакратар ЦК КП(б)У тав. Хрушчоў, старшыня Соўнаркома Украіны тав. Каротчэнка, пісьменнікі Бажан, Тычына, прэзідэнт Акадэміі навук УССР тав. Багамолец, родзіч вялікага кабзара Цярэнцій Шэўчэнка. Ад беларускай дэлегацыі выступіў тав. Колас.

6 сакавіка ўвечары ў памяшканні Опернага тэатра адбылося ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае Шэўчэнка. З дакладам выступіў пісьменнік-ордэнаносец тав. А. Карнейчук. З прывітаннямі украінскаму народу выступілі прадстаўнікі Грузіі, Арменіі, Азербайджана. Ад беларускай дэлегацыі выступіў тав. Купала.

З вялікім уздымам, пры бурным лікаванні ўсіх прысутных на пасяджэнні прынят тэкст прывітальных пісем таварышу Сталіну і таварышу Молатаву.

На 9 сакавіка намечана адкрыццё мастацкай выстаўкі, прысвечанай Т. Г. Шэўчэнка.

Ю. РУДЗЬКО.

УКАЗ

Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

АБ УВЕКАВЕЧАННІ ПАМЯЦІ ПАЭТА Т. Г. ШЭЎЧЭНКА У СУВЯЗІ З 125-ГОДДЗЕМ З ДНЯ ЯГО НАРАДЖЭННЯ

У сувязі з 125-годдзем з дня нараджэння Т. Г. Шэўчэнка для ўвекавечання памяці паэта:

1. Прысвоіць імя Т. Г. Шэўчэнка Дзяржаўнаму ордэна Леніна Кіеўскаму Акадэмічнаму тэатру оперы і балета.
2. Прысвоіць імя Т. Г. Шэўчэнка Дзяржаўнаму Кіеўскаму універсітэту.
3. Совету Народных Камісараў СССР устанавіць дзве стыпендыі імені Т. Г. Шэўчэнка ў Ленінградскай акадэміі мастацтваў.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 5 сакавіка 1939 г.

ПАМЯЦІ Т. Г. ШЭЎЧЭНКА

Грамадскасць сталіцы БССР адзначае 125-годдзе з дня нараджэння геніяльнага украінскага паэта Тараса Грыгоравіча Шэўчэнка радам мерапрыемстваў.

Да юбілея Т. Г. Шэўчэнка кампазітары БССР напісалі каля 30-ці твораў на тэксты вялікага паэта. Дэпутат Вярхоўнага Совета БССР кампазітар Туранкоў напісаў вялікі хор «Вецер буйны», кампазітар Шчэглоў — хор «У агародзе пастэрнак». Напісана шмат песень і рамансаў. Найбольш цікавыя з іх — песні «Пастаўлю маленькую хату» і «Мне ўсёроўна» — музыка дэпутата Вярхоўнага Совета БССР кампазітара Багатырова. Абедзве песні насычаны вялікім драматызмам. Своеасабліва і арыгінальна падышоў да тэкстаў Шэўчэнка кампазітар Клумаў, які таксама напісаў дзве песні — «Ой, цясёмачкі ды строчкі» і «Чаравічкі». З вялікім настроем зроблена кампазітарам Самохіным «Дума». У плане беларускага народнага каларыту напісана кампазітарам Сакалоўскім песня «Калі-б мне ды чаравічкі».

Усе напісаныя беларускімі кампазітарамі творы будуць выкананы ў сакавіку на адкрытым юбілейным канцэрце ў Менску, а ў маі — перад урадам Украіны і працоўнымі Кіева, куды выедуць кампазітары і выканаўцы. Сярод апошніх—засл. арт. рэсп. Млодэк, Аляксеева, Балоцін, Дзянісаў, дыпламантка Руч'ёва, артыст Лапін і інш.

Украінская капэла «Думка» рыхтуе к гэтаму канцэрту хоры Туранкова і Шчэглова.

Выстаўка прысвечаная Т. Г. Шэўчэнка

9 сакавіка ў Дзяржаўнай бібліятэцы імя Леніна адкрываецца вялікая выстаўка літаратурных, ілюстрацыйных і іншых матэрыялаў, прысвечаных Тарасу Грыгоравічу Шэўчэнка. Выстаўка пакажа, з якой любоўю адносяцца народы СССР да вялікага паэта. Выстаўка адлюструе жыццё і творчасць Шэўчэнка, эпоху, у якой ён жыў і працаваў, годы выкупу ад памешчыка Энгельгардта, годы ссылкі, зварот Шэўчэнка з ссылкі і апошнія годы яго жыцця. Асобныя аддзелы выстаўкі будуць прысвечаны Шэўчэнка і рускай літаратуры, Шэўчэнка і беларускай літаратуры, Шэўчэнка — мастаку, Шэўчэнка ў музыцы і г. д.

Выстаўка будзе налічваць звыш 850 экспанатаў. Частка іх будзе атрымана з Ленінграда і Кіева.

ВЫДАВЕЦТВА „МАСТАЦТВА“ ПАМЯЦІ Т. Г. ШЭЎЧЭНКА

Выдавецтва «Мастацтва» выпускае з друку аповесць В. Сухадольскага «Юнацтва Тараса» — аб юнацкіх гадах прыгоннага мастака.

Выдаюцца зборнік вершаў і паэм Шэўчэнка і яго трагедыя «Назар Стадоля».

Выдаюцца дзве кнігі: «Шэўчэнка»—біяграфія вялікага мастака-паэта і «Шэўчэнка-мастак» — манаграфія ілюстраваная 60 рэпрадукцыямі карцін і зарысовак Шэўчэнка.

125-ГОДДЗЕ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Т. Г. ШЭЎЧЭНКА

Шэўчэнкаўскія матывы ў творчасці Янкі Купалы

В. БАРЫСЕНКА

Вялікі ўкраінскі паэт Тарас Грыгоравіч Шэўчэнка сваёй творчасцю аказваў і аказвае велізарны ўплыў на развіццё літаратур раней прыгнечаных нацыянальнасцей Расійскай імперыі, а сёння свабодных братніх народаў Совецкага Саюза. Вялікі ўплыў аказала паэзія Шэўчэнка на развіццё беларускай літаратуры, на творчасць такіх нашых пісьменнікаў, як Колас, Бядуля, Трус, Броўка, Куляшоў і інш. Асабліва моцна сказаўся ўплыў шэўчэнкаўскай паэзіі на творчасці Янкі Купалы.

Янка Купала па характару свайго паэтычнага даравання блізкі да вялікага украінскага паэта, ён захапляўся творчасцю Шэўчэнка яшчэ ў маленстве і дакладна яе ведаў. Будучы самабытным пісьменнікам, Купала наследаваў лепшыя традыцыі паэзіі Шэўчэнка і многаму вучыўся; як паэт, у славутага украінскага кабзара.

Пачнем з указання на агульнасць эстэтычных прынцыпаў аднаго і другога паэта.

Служыць народу, заклікаць яго на барацьбу за социяльнае і нацыянальнае вызваленне, асвятляць шляхі гэтай барацьбы—такі погляд на задачы паэзіі чуецца ва ўсіх значных творах Шэўчэнка.

Купала ў многіх творах («Отпаведзь», «Я не паэт», «Да сваіх песень», «Я не сокал», «Да сваіх думак») чотка выкладае ў паэтычнай форме свае эстэтычныя прынцыпы. Апяваць «долю-нядолю народа, служыць сваёй творчасцю народу, «будзіць тых, хто церпіць без віны», заклікаць народныя масы на рэволюцыйную барацьбу супроць шматлікіх парабашчальнікаў і эксплаататараў, на барацьбу за социяльнае і нацыянальнае вызваленне — такія задачы, следуючы прынцыпам Шэўчэнка, акрэсліваў і ставіў перад сваёй музай Янка Купала з першых дзён свайго выступлення ў беларускай літаратуры.

Асноўнай, дамініруючай тэмай паэзіі Шэўчэнка з'яўляецца апісанне жыцця народа. Сваім рэалістычным словам Шэўчэнка разбураў рэакцыйную рамантыку дваранскай літаратуры, якая паказвала ўкраінскае сяло эпохі прыгонніцтва як «зямны рай», дзе пануе згода паміж селянінам і панам. Вёска ў паказе генія украінскай літаратуры перапоўнена социяльнымі кантрастамі. Гэта — вёска, якая сумяшчае ў сабе раскошу панскага двара і жабрацтва сялянскай хаты, вёска, у якой кіпіць нестухаючая барацьба паміж прыгнечанымі і эксплаататарамі. У творы «Сон» паэт з гарачым пратэстам і абурэннем малюе бязрадаснае жыццё прыгоннага селяніна:

Вунь, глянь,—у тым раі, што ты пакідаеш,
Латаную світку з калекі знімаюць,
Са скурай знімаюць — бо нэчым абуць
Княжат недарослых. А вунь распінаюць
Удаву за падаткі, а сына куюць,
Удавы няшчаснае адзінага сына,
Адзіну надзею,—у войска аддаюць,
Бо войска, бач, мала. А вунь дзе пад тынам
Апухлае дзіце галоднае мрэ,
А маці пшаніцу на паншчыне жнэ.

Як многа падобнага ў самым падыходзе і характары мастацкага паказу вёскі ў творчасці Шэўчэнка і Купалы! Купала наследуе лепшыя традыцыі творчасці Шэўчэнка, вучыцца ў яго праўдзівасці паказу народнага жыцця і тонкасці выяўлення народных пачуццяў. Ён даў нам здзіўляючыя карціны паднявольнага жыцця беларускай вёскі, паказаў социяльныя кантрасты ў нашай дакастрычніцкай вёсцы, малюючы дэспатызм рускага царызма і жабрацкае становішча працоўных мас. Укажам хаця-б на такія творы Купалы, як «Для куска хлеба», «Вось тут і жыві», «Не тужы», «Не дружы», «Якія», «Не кляніце мяне».

Станоўчыя вобразы Купалы таксама пераклікаюцца з вобразамі Шэўчэнка. Матывы сялянскай беднасці, горкай долі прыгоннага селяніна, замучанага панскай эксплаатацыяй, доля жанчыны, сіраты, сялянскіх дзяцей, царскага салдата — усе гэтыя дамініруючыя матывы шэўчэнкаўскай паэзіі з'яўляюцца дамініруючымі матывамі і ў лірыцы Я. Купалы дакастрычніцкай пары.

Шэўчэнка з асаблівай мастацкай сілай паказаў у сваіх творах («Марына», «Ведзьма», «Наймітка») жахлівую долю жанчыны-сялянкі ва ўмовах прыгону. У паэтычных тварэннях Шэўчэнка як жывыя намаляваны вобразы дзяўчат і жанчын, замучаных панскай няволяй, дзікім свавольствам памешчыка. Народны паэт становіцца на абарону цёмнай, забітай і паднявольнай жанчыны, якую разбэшчаны пан пазбаўляе шчасця кахання і мацярынства.

У творах Купалы «Зімой», «Не чапайся, панічок», «Паніч і Марыся», «Раскіданае гняздо» доля працоўнай сялянкі паказана ў гэтым-жа плане. Кожны радок твораў паэта насычан гарачым гневам і пратэстам супроць прыгнятальнікаў, гарачым спачуваннем да працоўнай жанчыны.

Вялікую ўвагу аддаваў і вялікае месца адводзіў у сваёй паэзіі украінскі рэволюцыянер-дэмакрат паказу долі сялянскіх дзяцей. Дзецям прысвяціў Шэўчэнка самыя пранікнёныя і цёплыя радкі. У творы «Сон» і яму падобных паэт расказвае суровую праўду пра трагічнае жыццё сялянскага дзіцяці ва ўмовах прыгонніцтва. Вобраз апухшага з голаду, пачарнеўшага ад холаду дзіцяці, вобраз сіраты, бацька і маці якога замучаны панскай эксплаатацыяй, шырока распрацаваныя ў паэзіі Шэўчэнка, займаюць вялікае месца і ў творчасці Янкі Купалы. У творах Купалы «Сірата», «Вось тут і жыві», «Доля ўдавы», «Не кляніце мяне» і інш. гэтыя матывы пададзены з выключнай сілай і майстэрствам. Творы Купалы «Сірата», «Сірочая доля», «Доля ўдавы» і інш. не толькі па тэматыцы, па матывах, па асноўных вобразах, але нават па рытмічнай структуры, па мелодыцы самога верша блізкія да такіх твораў Шэўчэнка, як «Сірата».

Шэўчэнка натхнёна і бязлітасна выкрываў сістэму гвалту і прыгнечання, што панавала ў прыгонніцкай Расіі таго часу. Уся творчасць Шэўчэнка дышыць святой нянавісцю да прыгнятальнікаў усіх нацыянальнасцей. Вялікім паэтам створаны глыбока рэалістычныя вобразы агідных ворагаў працоўнага народа, польскіх і украінскіх памешчыкаў, царскіх чыноўнікаў, лібералаў і г. д. Паэт з гнеўнай нянавісцю па адрасу паноў прадракаў хуткую расправу магутнага народа над сваімі спрадвечнымі ворагамі. Ён папярэджваў паноў, што:

Раскуюцца неўзабаве
Скованыя людзі;
Суд настане, загавораць
І Дняпро, і горы,
Кроў пацячэ дзяцей вашых
У сіняе мора
Сто рэкамі... І не будзе
Каму памагаці,
Ацураюцца брат брата
І дзіцяці маці;
І дым хмараю заслоніць
Сонца перад вамі,
Будзеце навек праклятымі
Сваімі сынамі.

У творах Купалы «Што ты спіш», «З прассоння», «Перад вісельняй», «Ужо днее», «Пашкадуй мужыка» з такой-жа сілай гучаць нянавісць да эксплаататараў і вера ў хуткую расправу народа над імі, вера ў тое, што народ —

...За крыўду сваю адамсціць,
Свінням будзе крыві не пабраць,—
Адамсціць, аж зямля задрыжыць,
Аж віхры зашумяць, загудзяць.

З вялікай сілай класавай нянавісці выступае Шэўчэнка супроць царскага дэспатызму і заклікае народ грамадою абух сталіць і добра вайстрыць сякеру:

А щоб збудить
Хиренну волю, треба миром,
Громадою обух сталить
Та добре выгострить сокиру,
Тай заходитись вже будить.

Янка Купала вобразам адточанай сякеры, узятай з рэволюцыйнай паэзіі украінскага кабзара, шырока карыстаецца як сімвалам рэволюцыйнай расправы народа з нянавісным парызмам, памешчыкамі і капіталістамі. Малады ў тыя часы паэт з вялікім пафасам прадракае Нікалаю II і ўсяму самадзяржаўнаму ладу:


Людской расплаты ужо над вамі
Тапор адточаны павіс.

Агульнасць матываў паэзіі Шэўчэнка і Купалы праяўляецца і ў абмалёўцы прыроды. Для Шэўчэнка прырода, пейзажныя вобразы ніколі не выконвалі ў мастацкім творы ролі ўкрасы альбо дэкарацыйнага прывеску.

І Янка Купала адным з першых у беларускай літаратуры адкрыў чытачу асаблівасці і прыгажосць беларускай прыроды. Для паэзіі Купалы прырода служыла крыніцай гукаў, фарбаў і вобразаў. Вобразы прыроды ў творах Купалы выкарыстоўваюцца ў якасці аб'ектаў палітычнай сімволікі.

Сугучнасць паэтычных галасоў Шэўчэнка і Купалы мы з пераканаўчай яснасцю бачым і ў поглядах аднаго і другога паэта на фальклор, і ў характары выкарыстання вуснай паэтычнай творчасці адным і другім пісьменнікам, і ў высокім паэтычным майстэрстве, з якім яны карысталіся народнымі сюжэтамі, вобразамі, тэмамі.

У беларускай літаратуры і ў галіне беларускай літаратурнай мовы Янка Купала і Якуб Колас прарабілі тую гіганцкую работу, якую Пушкін прарабіў у галіне рускай літаратуры і мовы і Шэўчэнка — у галіне украінскай літаратуры і мовы. Янка Купала і Якуб Колас, гэтак-жа, як Шэўчэнка, у украінскай літаратуры, сталі асновапаложнікамі беларускай літаратурнай мовы, глыбока выкарыстаўшы багацце і прыгажосць жывой народнай мовы.



Т. Г. Шэўчэнка. Аўтапартрэт. Рэпрадукцыя фотахронікі ТАСС.

ПАД ЖЫВАТВОРЧЫМ УПЛЫВАМ ШЭЎЧЭНКА

М. ЛАРЧАНКА

Тарас Грыгоравіч Шэўчэнка — глыбока народны паэт. Неўміручы народны голас шэўчэнкаўскай песні прагучаў на ўвесь свет і, адгукнуўшыся ў сэрцах прыгнечаных народаў царскай Расіі, пакінуў у працоўных масах свой незабыўны след. Беларускі народ, як родны брат рускага і украінскага народаў, у развіцці сваёй літаратуры многім абавязан Шэўчэнка. Шэўчэнка аказаў плодатворны ўплыў на развіццё беларускай літаратуры і ў першую чаргу на нашых народных паэтаў — Якуба Коласа і Янку Купалу.

Шэўчэнкаўскія матывы ў коласаўскім паказе дарэволюцыйнага жыцця працоўных мас беларускага народа праяўляюцца вельмі яскрава. Перш за ўсё кідаюцца ў вочы некаторыя агульныя паэтычныя рысы і матывы, якія родняць творчасць Коласа з творчасцю Шэўчэнка. Гэта з усёй яскравасцю выступае ў лірычных вершах Шэўчэнка і Коласа. Возьмем чароўны верш Шэўчэнка «Думы мої, думы мої». У ім выказан лейт-матыў паэзіі Шэўчэнка. Увесь верш разам з яго чаруючым сумам, пяшчотнай журбою і бязмежнай любоўю да свайго народа і радзімы прасякнут нянавісцю да прыгнятальнікаў.

Гэты шэўчэнкаўскі матыў здаровага чалавечага суму і журбы, што ўзніклі на аснове вялікай любві паэта да свайго народа, які знаходзіўся пад страшэнным прыгнётам, пранізвае сабою і ўсю дарэволюцыйную лірыку Коласа. Колас ужо ў сваім першым вершы гаварыў, каб у яго не пыталі і не прасілі «светлых песень».

Не пытайце, не прасіце
Светлых песень у мяне,
Бо як песню заспяваю,
Жаль вам душу скалыхне.

У Шэўчэнка матыў суму і журбы пераходзіць у матыў нянавісці і пратэсту супроць прыгнятальнікаў. Шэўчэнка гаворыць, што «журбою не накличу собі долі, коли так не маю». «нехай злидни живуть три дні — я їх захoваю, захoваю змію люту коло свого серця, щоб вороги не бачили, як лихо сміється». «Отаке то... А що робить? Журба не поможе». І ён з страснай нянавісцю пратэставаў і заклікаў народ на рашучую барацьбу супроць царызма і памешчыкаў.

Коласаўскі сум і журба таксама пераходзілі ў гнеўны рэволюцыйны пратэст супроць прыгнятальнікаў. У вершы «Песняру» (1910) Колас заклікаў заспяваць такую песню, якая-б «маланкай жахала», «паліла нядолю людскую» і «грымела, як гнеў Перуна». У Коласа, як і ў Шэўчэнка, ёсць багата твораў, у якіх з гнеўным сарказмам высмейваецца царска-памешчыцкі лад.

Шэўчэнка ў гнеўных радках, накіраваных супроць цара, пісаў: «О, люди! Люди небораки! На що здалися вам царі? Нащо здалися вам псарі? Вы-ж такі люди, не собаки!» А Колас у вершы «Малебен» гаворыць: «Ці-ж цар нам патрэбен? Патрэбен ён, братцы, як прус у аладцы, як у мосце дзірка, як з гразі зацірка, як скула-балячка».

Шэўчэнка быў вялікім патрыётам і гуманістам. Дзе-б ён ні быў, ці то ў Пецербургу, ці то ў далёкай ссылцы, ён заўсёды думаў аб сваёй радзіме і сваім народзе. Ён любіў сваю радзіму і свой народ. Надзвычай багата шэўчэнкаўскіх матываў у апяванні радзімы і народа знаходзім мы і ў дарэволюцыйнай творчасці Якуба Коласа.

Шэўчэнка амаль у кожным сваім творы заўсёды, ці то з вялікай журботнай горыччу, ці то з задушэўнай пяшчотнай радасцю, успамінае сваю радзіму, мілую Украіну.

Нехай думи козацькії
В Украйні витають —
Там широко, там весело
От краю до краю...
Як та воля, що минулась,
Дніпр широкий — море.
Степ і степ, ревуть пороги,
І могили — гори.
А над нею, орел черний
Сторожем літає.
І про неї добрим людям
Кобзари співають.

Якуб Колас у вершы «Палессе» (1916) ў эмацыянальным шэўчэнкаўскім тоне гаворыць аб сваёй радзіме, аб краі лясоў і балот. І калі Колас вымушан быў пакінуць свой край, ён таксама, як і Шэўчэнка, з болем у сэрцы і горыччу гаворыць аб сваім любімым краі:

Я люблю твой прастор,
Гмах шырокіх балот,
Дзе бубняць бугаі,
Дзе красуе чарот,
І дзе травы, як мора, ляглі.
Я далёка цяпер
Ад палесскіх раўнін,
А люблю-ж я той край,
Бо яго родны сын,
І па ім мае сэрца баліць.

Будучы ў турме, Шэўчэнка жыў думамі аб сваім народзе і радзіме. Ён быў не адзінокім. Колас таксама, знаходзячыся ў турэмнай адзіноце, сваімі думамі быў з народам: «Не смуткуйце-ж вечарамі, думкі, гора дзеці! Хоць мне цяжка, толькі з вамі не адзін я ў свеце».

Надзвычай ярка выступае агульная паэтычная рыса між шэўчэнкаўскім і коласаўскім пейзажам. Мастацкая асаблівасць шэўчэнкаўскага пейзажа заключаецца ў тым, што прырода рысуецца і апяваецца ва ўсёй сваёй велічы і чароўнай прыгажосці для таго, каб паказаць нікчэмнасць, непрыгляднасць і страшэнную беднасць тагочаснага социяльнага жыцця. У такім-жа мастацкім плане паказваецца прырода ў дарэволюцыйнай творчасці Якуба Коласа. Возьмем, напрыклад, верш «Неба» (1909). Тут у пачатку даецца карціна прыгожага зорнага неба, а на яго фоне паказваецца непрыгляднае, цёмнае і непрыгожае жыццё на зямлі ў эпоху царызма. У такой-жа форме падаецца большасць пейзажных зарысовак і ў паэмах Коласа «Новая зямля», «Сымон Музыка» і інш.

Родствена між сабою творчасць Шэўчэнка і творчасць Коласа па той крыніцы, з якой абодва паэты чэрпалі жывіцельныя сокі сваёй паэзіі. Творчасць Шэўчэнка сваімі каранямі глыбока ўваходзіла ў вусную творчасць украінскага народа. Паэзія Коласа таксама выходзіць з беларускага фальклору і арганічна звязана з народнымі песнямі, казкамі, былінамі.

Якуб Колас вучыўся ў Шэўчэнка сонечнай яркасці і мудрай прастаце ў паказе народнага жыцця. Адсюль падобнасць коласаўскай мастацкай формы да шэўчэнкаўскай. Паэтычная мова, рытмічны склад верша, чаруючая музычная пяшчотнасць шэўчэнкаўскай паэзіі знаходзяць свае месца і ў творчасці Якуба Коласа. Вучоба Коласа ў Шэўчэнка ўзбагаціла паэзію Якуба Коласа і ўзняла яе на сапраўдную паэтычную вышыню.

Праф. М. ДАБРЫНІН

ПЯСНЯР БРАТЭРСТВА

Важнейшай адзначальнай рысай творчасці Тараса Грыгоравіча Шэўчэнка з'яўляецца народнасць. Шэўчэнка народны паэт у самым лепшым і самым дакладным значэнні гэтага слова. Гэта рыса творчасці Т. Г. Шэўчэнка была адзначана яшчэ сучаснікамі. Так, Н. А. Дабралюбаў, які адмовіў многім і многім мастакам у званні народных, у спецыяльнай рэцэнзіі пра «Кабзар» Тараса Шэўчэнка пісаў: «Ён паэт — зусім народны, такі, якога мы не можам указаць у сябе. Нават Кальцоў не ідзе з ім у параўнанне, таму што складам сваіх мыслей і нават сваімі імкненнямі часам аддаляецца ад народа. У Шэўчэнка, наадварот, увесь круг яго дум і спачуванняў знаходзіцца ў поўнай суадпаведнасці з сэнсам і ладам народнага жыцця. Ён выйшаў з народа, жыў з народам і не толькі мысляю, але абставінамі жыцця быў з ім моцна і кроўна звязан».

Шэўчэнка — народны паэт па ўмовах свайго жыцця, па складу мыслі і пачуцця. Увесь жыццёвы шлях яго, шлях барацьбы і пакут, сказаўся на яго паэзіі, на яго думах і песнях:

Ой вы, думы, мае думы,
Кветкі мае, дзеці!
Вырашчаў вас, даглядаў вас,
Дзе-ж мне вас падзеці?
На Украіну йдзіце, думы,
На нашу Украіну,
Пад платамі, сіратамі,
А я — тут загіну.
. . . .
Прывітай-жа, мая маці,
Мая Украіна,
Маіх дзетак неразумных,
Як роднага сына!

З аналізу творчасці і ўмоў жыцця Шэўчэнка лёгка бачыць, што ён ведаў і любіў народ не па чутках, не з боку, а кроўна, бо ён пражыў цяжкое і пакутлівае жыццё працоўнага чалавека. Яго народнасць з'яўлялася арганічнай уласцівасцю натуры, складам яго мыслі і пачуцця, карацей — яна складала аснову яго творчасці. «Народнасць у пісьменніка ёсць годнасць, якая ўпаўне можа быць ацэнена адны мі суродзічамі, — для іншых яна ці не існуе, ці нават можа паказацца парокам — вучоны немец абураецца на пачцівасць герояў Расіна, француз смяецца, бачачы ў Кальдэроне Карыёлана, выклікаючага на дуэль свайго супраціўніка. Усё гэта носіць аднак-жа адбітак народнасці.

Ёсць парадак мыслей і адчуванняў, ёсць безліч звычаяў, і павер'яў, і звычак, належачых выключна якому-небудзь народу — клімат, форма праўлення, вера надаюць кожнаму народу асаблівую фізіяномію — якая больш і менш адбіваецца ў люстры паэзіі». Так аб народнасці пісаў А. С. Пушкін, абараняючы народнасць не ў выбары прадмету паказу, не ў словах, а ў самым духу пісьменніка, у парадку яго мыслей і адчуванняў. З гэтага пункту погляду Тарас Грыгоравіч Шэўчэнка сапраўды народны украінскі паэт.

Яго народнасць раскрывалася ў такіх рысах творчасці, як рэалізм і гуманізм. Шэўчэнка — рэаліст, гэта бясспрэчна, як Гогаль — рэаліст, не гледзячы на свае рамантычныя творы. Як той, так і другі не адразу сталі рэалістамі, а прайшлі папярэдні этап рамантызма. Аднак, рамантызм Шэўчэнка павінен разумецца як адлюстраванне тых-жа імкненняў і спадзяванняў, якія складаюць сілу яго рэалізма. Рамантычныя матывы Шэўчэнка, яго адыход ад рэчаіснасці ў далёкае мінулае Украіны былі прадыктаваны жаданнем абудзіць дух барацьбы за свабоду, за незалежнасць, дух барацьбы супроць самадзяржаўя і прыгонніцтва. Таму не варта ў рамантычных творах Шэўчэнка шукаць гістарычнай праўды, разглядаць іх як рэальнае адлюстраванне рэчаіснасці, — наадварот, у іх трэба бачыць выражэнне пратэсту супроць сучаснай рэчаіснасці і пошукі ў далёкім мінулым узораў для барацьбы з сучасным грамадскім парадкам. Гэткая, напрыклад, паэма «Гайдамакі», «Тарасава ноч» і інш.

Сапраўдную сілу творчасці Шэўчэнка складае рэалізм. Мы памятаем вызначэнне рэалізма ў Энгельса ў яго пісьме да Маргарэты Гаркнес, дзе сказана: «На мой погляд рэалізм мае на ўвазе, акрамя праўдзівасці дэталей, правільнасць перадачы тыповых характараў у тыповых акалічнасцях... Рэалізм, які я меў на ўвазе, праяўляецца, нават не гледзячы на погляды аўтара». Рэалізм Шэўчэнка дае праўду жыцця, ён паказвае нам тыповыя характары ў тыповых акалічнасцях. У гэтым сэнсе Шэўчэнка з'яўляецца паэтам-рэалістам, для якога не было прадметаў паэтычных і непаэтычных, усё было прадметам паэзіі. Пад яго пяром самыя брудныя з'явы жыцця ператвараліся ў золата паэзіі. Вернасць жыццю, праўда як раскрыццё асноўных тэндэнцый эпохі — складае сілу рэалізма Шэўчэнка. Гэткія яго «Сон», «Цары» і многія іншыя творы.

Але даваць праўду жыцця ў 40—50 годах азначала агаляць усе язвы гнуснай расійскай рэчаіснасці, азначала штурхаць, клікаць чытача да пратэсту, да барацьбы супроць самадзяржаўна-бюракратычнага ладу. Сваімі яркімі вобразамі Шэўчэнка рэволюцыянізіраваў свядомасць чытачоў, а яго рэалізм з простага адмаўлення перарастаў у рэволюцыйнае адмаўленне. Сілу гэтага адмаўлення складаў дэмакратызм. Вось чаму рэалізм Шэўчэнка мы называем рэволюцыйна-дэмакратычным, бо гэтыя дзве рысы адрозніваюць яго нават ад такіх пісьменнікаў, як Гогаль. Шэўчэнка па характару свайго рэалізма далучаецца да той плыні рускай літаратуры, на чале якой стаялі Чэрнышэўскі, Дабралюбаў, Некрасаў. Гэта — рэволюцыйная сялянская дэмакратыя; такім-жа паэтам рэволюцыйнай сялянскай дэмакратыі з'яўляецца Шэўчэнка.

Ён — паэт-грамадзянін, яму чуждь матывы так-званага чыстага мастацтва і грамадзянскі пафас складае сілу яго творчасці. Ён наш народны паэт, наш таму, што па асноўных момантах складае адно з лепшымі перадавымі плынямі рускай грамадскай мыслі, ён складае адзінства з рускай рэволюцыйнай дэмакратыяй, бо інтарэсы рускага і украінскага народаў былі аднолькавымі. У рэалізме Шэўчэнка быў той-жа лозунг, які ў сваім рэалізме высоўваў Дабралюбаў, гэта лозунг — «каб усім было добра». Адзінства інтарэсаў рускага і украінскага народаў было той глебай, на якой вырастала адзінства характару і матываў паэзіі Шэўчэнка з рускай рэволюцыйна-дэмакратычнай літаратурай.

У сувязі з гэтым трэба некалькі слоў сказаць аб патрыятызме і нацыяналізме Шэўчэнка, аб рысах яго творчасці, якія вельмі няправільна тлумачацца ўсякімі ворагамі народа, што імкнуцца супроцьпаставіць рускі і украінскі народы, а адсюль і Шэўчэнка супроцьпаставіць рускай літаратуры. Пачуццё нацыянальнай гордасці не з'яўляецца чымсьці зазорным, як і любоў да сваёй радзімы. Наадварот, гэта вялікае пачуццё, калі толькі яно не ператвараецца ў вузка-замкнутую ізаліраванасць і спалучаецца з любоўю да іншых народаў. Нам успамінаюцца артыкул Леніна «Аб нацыянальнай гордасці вялікарусаў» і артыкулы І. Сталіна па нацыянальнаму пытанню.

В. І. Ленін 12 (25) снежня 1914 года пісаў: «Ці чуждае нам, вялікарускім свядомым пролетарыям, пачуццё нацыянальнай гордасці? Вядома, не! Мы любім сваю мову і сваю радзіму, мы больш за ўсё працуем над тым, каб яе працоўныя масы (г. зн. 9/10 яе насельніцтва) узняць да свядомага жыцця дэмакратаў і соцыялістаў. Нам балючай за ўсё бачыць і адчуваць, якім гвалтам, гнёту і здзекам падвяргаюць нашу цудоўную радзіму царскія каты, дваране і капіталісты. Мы ганарымся тым, што гэтыя гвалты выклікалі адпор з нашага асяроддзя, з асяроддзя вялікарусаў, што гэта асяроддзе вылучыла Радзішчэва, дзекабрыстаў, рэволюцыянераў-разначынцаў 70-х гадоў, што вялікарускі рабочы клас стварыў у 1905 годзе магутную рэволюцыйную партыю мас, што вялікарускі мужык пачаў у той-жа час станавіцца дэмакратам, пачаў звяргаць папа і памешчыка».

Калі мы дададзім сюды рад артыкулаў таварыша Сталіна па нацыянальнаму пытанню, дык зразумеем, як можна, з'яўляючыся народным украінскім паэтам, поўным любві да сваёй Украіны, не ператварацца ў вузкага нацыяналіста, настроенага варожа ў адносінах да іншых народаў.

Мы ведаем, што ў 60-я годы XIX стагоддзя пролетарыята ў Расіі як сілы, вызначаючай ход гістарычнага развіцця, яшчэ не было. Але гэта зусім не азначае, што не было глебы для братняга саюза сялян Расіі і Украіны; яна была, бо прыгоннае права і гнёт самадзяржаўна - бюракратычнага памешчыцкага ладу выклікалі аднолькавы пратэст і рускіх і украінскіх сялян, і рускай і украінскай інтэлігенцыі. Таму мы, гаворачы аб нацыяналізме і патрыятызме Шэўчэнка, бачым у іх не абмежаванасць вузкімі рамкамі, а жаданне свайму народу такой-жа свабоды і шчасця, як і іншым народам. Барацьбу Шэўчэнка з самадзяржаўна-бюракратычным прыгонніцкім ладам не трэба разумець, як барацьбу супроць рускага народа, супроць рускага мужыка. Іншымі словамі кажучы, у Шэўчэнка быў здаровы патрыятызм і нацыяналізм, аб якім можна было-б сказаць словамі яго сучаснікаў.

Вось як аб гэтым пісаў Чэрнышэўскі: «Як усе высокія словы, як любоў, дабрачыннасць, слава, ісціна, слова «патрыятызм» часам ужываецца на зло не разумеючымі яго людзьмі для азначэння рэчаў, не маючых нічога агульнага з ісцінным патрыятызмам; таму ужываючы свяшчэннае слова «патрыятызм», часта бывае неабходна вызначаць, што іменна мы хочам разумець пад ім... Найвышэйшы патрыятызм — страснае, бязмежнае жаданне дабра радзіме».

А Дабралюбаў як-бы прадоўжвае:

«Патрыятызм ёсць не што іншае, як жаданне працаваць на карысць сваёй краіны, і выцякае не ад чаго іншага, як ад жадання рабіць дабро — колькі магчыма лепш.

...Патрыятызм жывы, дзейны іменна і адрозніваецца тым, што ён выключае ўсякую міжнародную варожасць, і чалавек, натхнёны такім патрыятызмам, гатоў працаваць для ўсяго чалавецтва...»

Ці не ўправе мы і патрыятызм Шэўчэнка разглядаць у такім-жа духу? Ці не такія-ж былі погляды Шэўчэнка на патрыятызм? Мы пераканаIы, што гэта іменна так, што Шэўчэнка, рэволюцыйны дэмакрат, не мог мець другой думкі па гэтаму пытанню. А ў такім выпадку яго любоў да Украіны перарастала ў любоў да ўсяго чалавецтва, у жаданне працаваць для ўсяго чалавецтва. Ён мог-бы сказаць аб сабе так, як сказаў аб сабе Шчэдрын: «Я люблю Расію да болю сардэчнага і нават не магу памысліць сябе дзе-небудзь, акрамя Расіі... Я жадаў бачыць маю бацькаўшчыну не столькі слаўнай, колькі шчаслівай — вось істотны змест маіх мараў на тэму аб велічы Расіі... Які народ можа з большым правам назваць сябе сапраўды слаўным, як не той, які адчувае сябе сапраўды шчаслівым?». Але гэта любоў да Расіі не выклікала ў Шчэдрына варожасці да іншых народаў, а, наадварот, рабіла яго гатовым працаваць для ўсяго чалавецтва. Такімі-б словамі мог выразіць сваю любоў да Украіны і Т. Г. Шэўчэнка. Яго нельга ўявіць без Украіны, так арганічна яго творчасць увайшла ў народнае жыццё і паэзію Украіны.

Лепшыя людзі 60-х год XIX стагоддзя паказалі прыклад адзінства сваёй любві да радзімы з любоўю да ўсяго чалавецтва, адзінства, якое было абумоўлена тым, што інтарэсы працоўных, становішча шырокіх народных мас было аднолькава цяжкім, адзінства, якое было абумоўлена барацьбой супроць расійскага самадзяржаўя і прыгонніцтва, аднолькава прыгнятаўшага усе народы, адзінства, якое выцякала з страснага жадання дабра ўсім народам Расіі, з жадання, «каб усім было добра».

Асаблівасцю паэзіі Тараса Шэўчэнка з'яўляецца яго гуманізм, як форма выражэння яго сапраўднай любві к чалавеку, яго тугі па волі, па свабодзе, яго смутку аб людзях-братах, яго шукання лепшага жыцця, яго нянавісці да прыгнятальнікаў усіх відаў і рангаў.

Такім чынам перад намі вялікі народны паэт, рэаліст, які выкрывае праўду жыцця так, што яна кліча людзей на рэволюцыйную барацьбу, паэт-дэмакрат, які выражае думы і мары шырокіх народных мас, паэт-грамадзянін з глыбокім пачуццём гуманізма, любві да чалавека, да ўсяго чалавечага. Народнасць, рэволюцыйна-дэмакратычны рэалізм, гуманізм і грамадзянскі пафас з'яўляюцца асноўнымі характэрнымі рысамі паэзіі вялікага народнага паэта Тараса Грыгоравіча Шэўчэнка. Ён не толькі паэт, але і змагар, рэволюцыянер, што вельмі добра выразіў Герцэн.

«Ён тым вялік, — сказаў Герцэн, — што ён зусім народны пісьменнік, як наш Кальцоў; але ён мае значна большае значэнне, чым Кальцоў, таму што Шэўчэнка таксама палітычны дзеяч і з'явіўся змагаром за свабоду».

Вялікі народны паэт Тарас Грыгоравіч Шэўчэнка не мог не быць змагаром, не мог не адлюстраваць думы і спадзяванні народныя, мары аб шчаслівым свабодным жыцці. Яго зброяй было слова, яго паэзія, якая ўвабрала таму ў сябе ўсю сілу і страсць барацьбы за свабоду шырокіх народных мас, увесь іх гнеў і прагу разбурэння самадзяржаўна - бюракратычнага ладу, прагу барацьбы супроць бога, цара і пана. Яго паэзія сама стала важнейшым фактарам гэтай барацьбы, зброяй у руках рэволюцыйнай сялянскай дэмакратыі, у яе барацьбе за свабоду народа.

125-ГОДДЗЕ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Т. Г. ШЭЎЧЭНКА

ТАРАС ШЭЎЧЭНКА І АЙРА ОЛДРЫДЖ

У гісторыі культуры цяжка знайсці другую сустрэчу, якая набыла-б такі вялікі сэнс, як сустрэча вялікага украінскага паэта Тараса Грыгоравіча Шэўчэнка з вялікім артыстам-неграм Айра Олдрыджам.

Гэтай знамянальнай сустрэчы нядаўна споўнілася 80 год, — і ўспомніць аб ёй у светлыя дні юбілея Шэўчэнка асабліва дарэчы.

Жыццё Олдрыджа мала каму вядома. Між тым Олдрыдж (нарадзіўся каля 1808 года — памёр у 1867 годзе) пяць разоў рабіў свае гастрольныя паездкі па Расіі, і, па волі лёсу, памёр і пахаван быў у Расіі.

Хлапчуком Айра пакляўся стаць артыстам, — прычым артыстам, які іграе Шэкспіра на мове Шэкспіра. Гэта была дзёрзкая мара. Негр не меў права глядзець на ігру белых актораў, а Олдрыдж марыў іграць для белых гледачоў!

З вялікай цяжкасцю ўдалося Олдрыджу дабіцца дэбюта на сцэне маленькага тэатра «Кобург» у Лондане. Ён выступіў у ролі, якая дазволіла яму без апаскі паказаць свой чорны твар і рукі, — у ролі Отэлло, у якой і белыя актёры прымушаны ператвараць сябе ў чорных. На долю Олдрыджа выпаў вялікі поспех, яму прапанавалі застацца ў трупе тэатра... але толькі з тым, каб іграць **чорныя** ролі — неграў і мулатаў, якімі багаты былі ў той час меладрамы і вадэвілі. Олдрыдж адмовіўся.

Олдрыдж вандраваў з краіны ў краіну, з горада у горад — па ўсёй Еўропе, і ў 1858 годзе ўпершыню трапіў у Расію.

Выступіўшы ў «Отэлло», ён меў велізарны поспех у дэмакратычнага гледача Расіі. Пасля першага паказу «Отэлло» адзін з такіх гледачоў пісаў: «Я ўпаўне пераканан, што пасля Олдрыджа няма магчымасці бачыць «Отэлло» у выкананні белага актора. У наш час роля Отэлло, выконваемая геніяльным артыстам-неграм, мае сэнс сусветны, вялікі. Ужо не Шэкспір, не Олдрыдж цікавіць нас, а негр наогул, якога абодва яны ставяць перад тварам уладарнага (г. зн. рабаўласніцкага ў Амерыцы, прыгоннага — ў Расіі, — **С. Д.**) грамадства ва ўсёй наіўнай, дзіцячай прастаце, з усімі скарбамі яго першабытнай любячай натуры. Бачачы маўра Отэлло ў сцэнах венецыянца Яго, міжволі ўспамінаеш аб многіх пакаленнях чорнага народа, які гібее пад бічамі амерыканскіх гандляроў».

Маўр Отэлло ў перадачы Олдрыджа з'яўляўся выразіцелем чалавечай годнасці і нечалавечых пакут чорнага народа, які імкнуўся да вызвалення. Калі-ж Олдрыдж іграў Шэйлока, ён станавіўся выразіцелем шматвяковых пакут другога ганімага народа — яўрэйскага.

Тады-ж, у 1858 годзе, завязалася дружба Олдрыджа з Тарасам Грыгоравічам Шэўчэнка.

Мастак Е. Ф. Юнге ўспамінае:

«Ён (Олдрыдж) прыехаў у Пецербург зімою ў 1858 годзе. Мы... накіраваліся кампаніяй глядзець яго ў «Отэлло» і прышлі ў неапісальнае захапленне, што пасля спектакля ўсе паехалі ў гасцініцу, дзе ён спыніўся, і чакалі яго там. Божа мой, што там было! Староў (прыяцель Шэўчэнка, прыхільнік Герцэна, — **С. Д.**) цалаваў яму рукі, «яго благародныя чорныя рукі!» Я ўся дрыжала ад хвалявання і канфузу, не паспявала перакладаць усё, што гаварылі і ўскліквалі акружаючыя; разам гучалі рускія, французскія, англійскія і нямецкія словы».

Такія былі ўражанні і пачуцці, абуджаемыя Олдрыджам у радыкальных кругах пецербургскага грамадства, дзе вызваленне чорных — амерыканскіх і белых—рускіх рабоў прымалася за адну вялікую палітычную і соцыяльную задачу часу.

Гэта асаблівае ўражанне ад Олдрыджа ўзмацнялася тым, што паралель: чорны раб — белы раб, чорны геній — белы геній рабілася асабліва яркай ад таго, што белы геній—вялікі ўкраінскі паэт Тарас Грыгоравіч Шэўчэнка якраз у гэты час вярнуўся ў Пецербург пасля жахлівай дзевяцігадовай ссылкі, у часе якой яму было забаронена пісаць і маляваць, — забаронена быць паэтам і мастаком! З сярэднеазіяцкай пустыні вярнуўся вялікі паэт, выпрабаваўшы, па яго словах, тое, што «не прывядзі госпадзі нікому на свеце выпрабаваць».

У Пецербургу Шэўчэнка сустрэўся з Олдрыджам. І яны, два былыя рабы зблізжаюцца. Олдрыдж паяўляецца ў доме Фёдара Талстога — віцэ-прэзідэнта Акадэміі мастацтваў, які хадатайнічаў аб звароце Шэўчэнка з ссылкі: «Бывала, увойдзе Олдрыдж сваёй шпаркай, энергічнай хадой, — успамінае дачка Ф. П. Талстога, — і зараз-жа запытаецца: «А дзе-ж артыст?» — так ён называў Шэўчэнка.

...Акрамя падабенства характараў, у гэтых людзей было шмат агульнага, што абуджала ў іх глыбокае спачуванне аднаго да другога. Адзін у маладосці быў прыгонным, другі належаў да пагарджаемай расы і выпрабаваў у жыцці шмат горкага і крыўдчага. Абодва горача любілі свой абяздолены народ. Памятаю, як яны былі расчулены, калі я расказала Олдрыджу гісторыю Шэўчэнка, а апошняму з слоў Олдрыджа пераклала гісторыю жыцця гэтага трагіка. Абодва яны здзіўляюча добра разумелі адзін другога... Шэўчэнка захацеў напісаць партрэт Олдрыджа. Некалькі хвілін чуваць было толькі скрыпенне алоўка аб паперу але ці мог Олдрыдж усядзець на месцы?.. «Можна спяваць?» — пытаўся ён раптам. — «А ну яго, няхай сабе спявае!».

Тарас Грыгоравіч захапляўся яго вясёласцю і спяваў яму ўкраінскія песні; завязваліся размовы аб тыповых рысах розных народнасцей, аб падабенстве народных паданняў і г. д.»

Партрэт вялікага артыста, выкананы вугалем і белым алоўкам, быў скончан 25 снежня 1858 года (такая адзнака зроблена на партрэце самім Шэўчэнка). Напісаны любячай рукой Шэўчэнка партрэт вылучаецца вялікім падабенствам і з'яўляецца каштоўным помнікам дружбы паміж трагікам-неграм і ўкраінскім паэтам, які толькі-што выратаваўся ад салдатчыны і няволі ў далёкай ссылцы. У сучасны момант партрэт Олдрыджа работы Шэўчэнка захоўваецца ў Маскве, у Дзяржаўнай Трэцьякоўскай галерэі.

У канцы XIX стагоддзя тэмай «Шэўчэнка, які піша Олдрыджа» натхніўся вядомы мастак Л. О. Пастэрнак і зрабіў малюнак, які паказвае двух сяброў — чорнага трагіка і народнага паэта.

Пасля гастролей у Пецербургу Олдрыдж накіраваўся ў Маскву — і там меў велізарны поспех. Яго высока цаніў бацька рэалізма на рускай сцэне—Міхаіл Сямёнавіч Шчэпкін. Ён, падобна Шэўчэнка, захапляўся вялікім майстэрствам Олдрыджа.

Расчулены поспехам у рускага дэмакратычнага гледача, Олдрыдж яшчэ чатыры разы прыязджаў на гастролі ў Расію, але ўсякі раз з горам адзначаў, што сярод яго гледачоў нехапае аднаго—самага чулага і дарагога для Олдрыджа — нехапае Т. Г. Шэўчэнка.

С. ДУРЫЛІН.

ЖЫВЕ ШЭЎЧЭНКА Ў ПАМЯЦІ НАРОДНАЙ

Украінскі пісьменнік Д. М. Касарык зрабіў пешае падарожжа па шляхах вандраванняў вялікага песняра ўкраінскага народа Т. Г. Шэўчэнка. У часе падарожжа ім запісана ад розных асоб — рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі шмат апавяданняў, легенд, песень і іншых фальклорных матэрыялаў, у якіх увасоблен вобраз геніяльнага народнага паэта, барацьбіта за волю і шчасце працоўнага народа — Т. Г. Шэўчэнка.

Друкуем некаторыя з запісаў таб. Касарыка.

***

Калі Шэўчэнка заходзіў у карчму з рыбакамі, дык заўсёды чарку за пазуху вылле і заводзіць песню пра наша сяло:

Монастирище
Добре селище,
Тут козаки живуть.

Супроць зарубінскага пана вельмі вострa прапаведваў. Бывала плыве па баркасе ўздоўж Дняпра, а за ім рыбакі на чоўнах. Найбольш ён з паноў насміхаўся. Зойдзе, бывала, на сход староста, багатыр на-дзіва,ураднік строгі, а Тараса Шэўчэнка баяўся, бо заліваў яму Тарас сала за скуру. Вопратка на Тарасе: чорны жупан у зборкі і заўсёды пад зялёным поясам.

Зачынялі колькі разоў яго ў турму; засудзяць, а ён уцячэ.

Аднойчы прышоў Тарас у царскі палац і ходзіць з торбаю на двары. А к рускаму цару ў госці нямецкі цар прыехаў.

— Чаго ў цябе тут жабракі ходзяць? — пытаецца нямецкі цар. Белы цар адказвае:

— Гэта паэт украінскі з няволі прыехаў.

Тады абодва цары звяртаюцца да яго:

— Скажы нам што-небудзь такое, чаго нават мы не чулі.

Шэўчэнка падцягнуў на плячах торбу, глянуў на царскія кароны, ды і кажа:

— Торба і карона хутка ў зямлю зарыюцца, ад іх і чэрві адцураюцца.

Тав. **Грушэцкі**, вагаўшчык пераяслаўскай рыбацкай арцелі.

***

— Ага, такія-сякія,—гневаўся Шэўчэнка на паноў, — красуецеся? Ды не век вам параваць. Не за гарамі час — адны пугачы засвішчуць у вашых маёнтках...

Адным словам, Шэўчэнка быў палітык.

Калгаснік **Я. Ю. Бойка**, сяло В'юнішчы Пераяслаўскага раёна.

***

Зімой таго года, як вялікая вада была (1845), Тарас Шэўчэнка жыў у В'юнішчах у Самойла. Неяк раз прышоў ён у шынок і пачаў там балакаць з дзядзькамі. А ў часе гутаркі раптам убачыў, што ў двары соцкага Цярэшчанка ідзе басаніж па снезе наймічка і нясе з варыўні мяшок. Шэўчэнка пабляднеў і паказаў людзям на ката. А пасля склаў пра наймічку думу.

Гэта было, вунь, у тым двары, дзе цяпер школьнікі ў перапынак гуляюць.

Калгаснік **В. С. Сівенка**, сяло В'юнішчы Пераяслаўскага раёна.

***

У Кіеве, па Хрэшчаціку № 2, там, дзе зараз будынак, была еўрапейская гасцініца. Летам звычайна ўсе столікі пазаймаНЫ. Сядзеў там пад пальмаю генерал з жонкаю. Зайшоў хлапец.

— Дайце боршч, — заказвае сабе, — і жаркое.

Генерал надумаўся паглуміцца над ім.

— Ты здалёку? — пытаецца ў хлапца. — А пачым свінні ў вашым сяле?

Хлапец скеміў, у чым справа, і не дараваў генералу.

— Гэткі, — кажа, — кабан, як пан, нічога не варты, а вось такая свінка, як ваша гаспадынька, — тая ў цане...

Усе здагадаліся, што гэта быў Шэўчэнка.

Рабочы **З. Е. Вараб'еў**, Кіеўская абутковая фабрыка № 8.

***

Плавалі нашы рыбакі з Тарасам, а пасля лову зайшлі на беразе ў шынок. Сядзеў там нейкі пан: разгаварыўся з Шэўчэнка, а на развітанне працягвае яму руку і падае адзін палец. Тарас пытаецца:

— Чаму-ж толькі адзін палец?

— Бачыце, — кажа пан, — калі я вітаюся з роўнымі сабе, дык падаю ўсю далоню, калі рангам ніжэй — чатыры пальцы, яшчэ ніжэй — тры альбо два, а ўсяму астатняму чыноўнаму люду даю адзін.

Тады Шэўчэнка яму і кажа:

— Дык-жа я не з чыноўнага люду, а просты мужык! Будзь ласка, пане, вазьміце поўпальца рэшты... — і паказаў яму дулю.

Калгаснік **П. М. Однарок**, арцель імя Горкага, Пераяслаўскага раёна.

Біяграфічны нарыс і партрэт Т. Г. Шэўчэнка

9 сакавіка ў выданні Акадэміі навук выходзіць з друку біяграфічны нарыс Т. Г. Шэўчэнка з партрэтам юбіляра. Аўтар нарыса—А. Альтман. Памер нарыса — 2 друкаваных аркушы, тыраж 8 тысяч экземпляраў.

***

Мастак В. Волкаў зрабіў інкрустацыйны партрэт Т. Г. Шэўчэнка. Партрэт будзе накіраван у УССР у падарунак працоўным братняй рэспублікі.



Хата ў Кірылаўцы, дзе нарадзіўся Т. Г. Шэўчэнка. З малюнка паэта.



У хуткім часе на экранах БССР з'явіцца выдатны гісторыка-рэволюцыйны мастацкі фільм «Ленін у 1918 годзе» вытворчасці «Мосфільм». НА ЗДЫМКУ: кадр з фільма «Ленін у 1918 годзе». Тав. Сталін (арт. Геловані) і тав. Варашылаў (засл. арт. РСФСР Н. І. Багалюбаў). Фотахроніка ТАСС.

„ТАНЯ"

(Дзяржаўны Рускі драматычны тэатр БССР)

П'еса А. Арбузова «Таня» апавядае пра ўзаемаадносіны маладых совецкіх людзей. Аўтар імкнецца вырашыць некаторыя пытанні сучаснай маралі. У прыватнасці, ён хоча паказаць новыя адносіны да пачуцця рэўнасці. Аб'ектамі для вырашэння сваёй задачы ён абірае студэнтку медыцынскага інстытута Таню і інжынера Германа. Спачатку ён іх жэніць, а потым надзвычай лёгка хоча ўпэўніць, што яны не сышліся характарамі, і яны разыходзяцца. Апошняя іх сустрэча адбываецца ўжо ў канцы п'есы, ды і то выпадкова: у Германа захварэла дзіця і Таня (якая па жаданню аўтара апынулася на Далёкім Усходзе) выратоўвае яго ад смерці.

На першы погляд можа здацца, што аўтар п'есы вельмі цікава хоча паказаць некаторыя бакі быту маладой сям'і, ён нібы зацікаўлен у найбольш поўным адлюстраванні жыцця і ва ўскрыцці чалавечых пачуццяў. Аднак новага ў п'есе нічога не сказана. Зноў мы бачым злашчасны драматургічны «трохкутнік», толькі на гэты раз у ім дзве жанчыны і адзін мужчына. Абражанай застаецца Таня, у яе памірае дзіця і ёй прыходзіцца перамагаць сваё гора, а каб забыцца пра ўсё — выехаць нават з Масквы і аддаць усю сябе медыцынскай рабоце. А ў героях ходзіць Герман. Ён жэніцца на Шаманавай (чалавеку «з добрым становішчам» і нават з ордэнам), а калі яго пасцігае гора, дык выратоўвае яго ніхто іншы, як добрая знаёмая, у мінулым каханая жонка, Таня. З гэтага можна зрабіць вывад, што калі чалавеку зрабілі зло, дык ён (г. зн. Таня) павінен змірыцца, а потым таму-ж, хто зрабіў зло (г. зн. Герману), аддзякаваць дабром. Не, у жыцці так не бывае.

Я асуджаю Германа, які бяздушна аднёсся да чалавека і дзеля сваёй выгады ажаніўся на другой жанчыне, і станаўлюся на абарону Тані, якую аўтар ашукаў і паставіў у вельмі невыгоднае становішча. Я разумею, чаму так здарылася. Аўтару трэба было хоць чым-небудзь расквеціць сваю п'есу, таму ён узяў на-пракат меладраматызм і, каб расчуліць гледача, увёў у дзею смерць дзіцяці, пажар на будоўлі далёкаўсходняга горада і нават раненне чалавека. Фон п'есы (г. зн. пабочныя падзеі) разрастаюцца ў асобную частку твора (мы маем на ўвазе эпізоды на Далёкім Усходзе) і ён зацікаўлівае гледача не сваімі мастацкімі якасцямі, а выключна тымі багатымі фактамі жыцця Далёкаўсходняга края, якія мы так часта сустракаем у газетах.

Аб вобразах людзей гаварыць цяжка, бо яны адсутнічаюць у п'есе. П'еса напісана ў форме дзённіка ў дыялогах. Аўтар як-бы запісаў некаторыя з'явы жыцця, але ператварыць іх у стройны драматургічны твор не здолеў. Не гледзячы на тое, што фармальна сюжэт створан, ён не можа сваім развіццём упэўніць гледача ў праўдзівасці адбываючыхся падзей.

Малады рэжысёр спектакля Ю. Трахцерава ачысціла тэкст п'есы ад налёту іржы мяшчанства, саладжавасці, ад некаторай нелагічнасці. Але п'еса патрабуе аўтарскіх дапрацовак і мы вельмі шкадуем, што пастаноўшчык не сустрэўся з драматургам і не папрацаваў з ім разам.

Цэнтральны вобраз Тані выпісан аўтарам даволі збіўчыва, зігзагападобна, нават учынкі яе іншы раз не апраўданы і непаслядоўны. Акт. Г. Галіна сабрала вобраз, сагрэла яго чалавечай абаяльнасцю. Іншы раз тэкст перамагаў актрысу, і яна, нібы блукаючы ў яго непаразуменнях, губляла мацярынскую клапатлівасць аб дзіцяці.

Значна лепш створан вобраз Ігната (акт. А. Белаліпецкі). Не гледзячы на тое, што аўтар робіць Сокалава таежна-дзікаватым чалавекам, актор знаходзіць для яго некаторыя лірычныя ноткі, ён адчувае дабрату гэтага простага звералова і надае яму рысы страснага кахання да Тані.

Свежа сыгран вобраз жыццёрадаснага радыста Васі (акт. Г. Іваноў).

У ролі старога яўрэя (акт. Н. Аблаў) і ў ролі буфетчыка-кітайца (акт. А. Якаўлеў) акторам трэба пазбегнуць нацыянальных асаблівасцей у мове. Гэта непрыемна гучыць для гледача, ды і к вобразу нічога новага не дадае.

Шкада, што тэатрам патрачана шмат сіл, а рэзультат такі малы. Спектакль патрабуе новай «рэдакцыі», выпраўленне памылак неабходна зрабіць зараз-жа.

А. ЕСАКОЎ.

САРА КАГАН

ПЕРШАЯ ПРЭМІЯ

МАНАЛОГ ПАЖЫЛОЙ ЖАНЧЫНЫ

1.

Вы кажаце, што Совецкая ўлада перавыхоўвае людзей,—чыстая праўда. І я тое самае кажу. Толькі не думайце, што я хачу вам падпяваць і таму гэта кажу. Не. Не туды заехалі. Я люблю праўду. За праўду я гатова рынуцца ў агонь і ваду.

Навошта далёка хадзіць. Возьмем, напрыклад, мяне. Ці-ж Совецкая ўлада мяне не перарабіла? Перарабіла, ды яшчэ як — цалкам, кажу вам, цалкам.

Што, не верыце? Ды як вы можаце верыць! Дзіва дзіўнага на мне не відаць. Такая, як усе людзі. Але, бачыце, у тым-то і ўся штука, увесь фокус, што я, Нахама Ступа з мястэчка Печышча, такая, як усе людзі. Калі-б вы пабачылі мяне за некалькі год да рэволюцыі, дык тады-б толькі зразумелі, які я шлях прарабіла.

Вы пытаецеся, што за Ступа? Ліха яго ведае! Адкуль мне ведаць? Я толькі адно ведаю, што гэту мянушку я атрымала ў спадчыну ад прадзедаў. Я, значыцца, ужо нарадзілася Ступай. Так іменавалі майго дзеда-балаголу Лэйзара, маю бабку, маю маці, майго бацьку, маіх братоў і сясцёр, маіх дзядзькоў і цётак, — увесь род. А трэба вам ведаць, што род наш у Печышчы быў не з апошніх. Па-першае, даволі шматлікі, — балай уся Замасцянская вуліца была заселена Ступамі, а, па-другое, мы славіліся ў мястэчку як самая патомственая беднота, а, па-трэцяе, у нашым горадзе былі рознастайныя майстры: і кравец, і шавец, і на цымбалах ігрэц; і плытагон, і лазакрут, і балагол-баламут; і кахаль, і анучнік, і вадавоз, і служанкі, і фарфэльніцы, і панчошніцы. Словам, сядзела бяда на бядзе, горам папірала, ліхам паганяла.

Але самыя «залатыя рукі» былі ў майго бацькі, Завэля Ступы—ён дратаваў гаршкі, простыя гліняныя гаршкі. Праўда, апрача таго, ён пачыняў свярдзёлкам старыя чыгуны, скаварады, але галоўным чынам ён займаўся дратаваннем гаршкоў.

Чаго вы дзівіцеся? Не ведаеце, што гэта за механіка? Адкуль яна бярэцца? Вы гэтага не можаце ведаць, бо ніколі ў вочы не бачылі. Пры Совецкай уладзе мы можам сабе дазволіць гатаваць ежу ў цэлых гаршках і ў чысценькіх беленькіх чыгунчыках. А калі каму ўздумаецца, дык ставіць на электрычную плітку алюмініевы казанок, і праз гадзіну гатоў абед—любата! А хочаш, яшчэ лепш — ідзеш у рэстаран і бярэш гатовенькае з самага лепшага і самага смачнага, што да сэрца! Але ўсё гэта — цяпер. А даўней?

Я кажу пра цёмнае даўнейшае, калі адна галадуха гасцявала ў кожнай беднай хацінцы, калі гліняны гаршчок быў адзінай пасудзінай у печы, а «бульба ў мундзірах» — і на сняданне, і на абед, і на вячэру. Тады бацькава «механіка» карысталася вялікай пашанай. Усе местачковыя гаспадыні звярталіся да бацькі. Гаршчок не любіць, каб у ім тры разы на дзень поснiца-трасца варылася. Ён гэта не вытрымліваў і хутка лопаўся. Тады з пакалечаным гаршком прыбягалі да майго бацькі на паратунак. Бацька браў гаршчок у рукі ды аглядаў яго, як сапраўдны лекар. Выстукваў пальцамі, прыслухоўваўся да яго хрыпу і тут-жа прыступаў да аперацыі. Ён моцна аплятаў гаршчок дротам з верху да нізу і навокал у прыгожыя перэпічкі. Гаршчок выходзіў з бацькавых рук куды прыгажэйшы, чым новы. Назаўтра зноў вараць у ім «бульбу ў мундзірах», а гаршчок хоць-бы табе што — ані не цячэ. Наадварот, у нас гаварылі, што задратаваны маім бацькам гаршчок трымаецца ў два разы больш, чым новы.

Вось з-за гэтага самага разумнейшыя гаспадыні, гэта значыць спрактыкаваныя гаспадыні, як толькі, бывала, купяць гаршчок, альбо гляк на цыкорыю, дык адразу нясуць яго дратаваць да майго бацькі. І павінна вам наогул сказаць, што ў той час у Печышчы вы рэдка-рэдка маглі ўбачыць гаршчок не дратаваны, скавараду не патрэсканую і чыгун, на якім не было-б трох ці чатырох латак, прымацаваных свердлам майго бацькі. Шкода, кажу вам, вельмі шкода, што дратаваныя гаршкі з Печышча не трапілі ў музей. Тады было-б залішняе тлумачыць вам прафесію майго бацькі.

Маці мая, уявіце, была таксама не абы-хто. Па-першае, яна скубла пер'е спрытней, лепш і танней за ўсіх. А па-другое, калі ў Печышчы здаралася няшчасце, калі хто раптоўна захворваў, —благое вока, там трасца, подвей, нячыстая сіла (і яшчэ шмат гэткіх хвароб, аб якіх не ведаю, дзе яны цяпер падзеліся), — дык адразу ўзнімалі крык: «Гвалт разбойнікі, ратуйце! Зараз-жа паклічце Фейгу-Рашу Ступу» (гэта значыць маю маці). Яна ведала замовы ад усялякіх хвароб. Качалкай з гарачага хлеба лячыла маленькіх ад болю жывата. Была вялікай мастачкай даставаць стрэмкі з-пад пазногцяў.

Ну, а я таксама не была шлімазарніцай. У дзесяць год я ўжо была служанкай у тоўстай Добы. Дзеці дражнілі мяне тады Нахамай Ступкай—валавянай бубкай. Праз вуліцу прайсці, кажу вам, не давалі. Уявіце сабе, і мой язык цяляты не ад'елі. Чаго-чаго, а мянушку ў нас кожнае дзіця ў мястэчку мела.

2.

Было гэта, каб вам не зманіць, чатырнаццаць-пятнаццаць, а можа ўсе шаснаццаць год таму назад. Гэта значыць тады, калі я ўпершыню паступіла прыбіральшчыцай у райком. Было гэта, памятаю як сёння, у самы люты мароз. Пастаяннай работы я не мела і вельмі сытай таксама не была. Раптам даведваюся, што ў райкоме патрэбна прыбіральшчыца. Канешне, я не чакала спецыяльнага запрашэння. Я адразу пусцілася бягом туды. Прышла, стаю ды чакаю. Хутка паклікалі мяне ў пакой. Пры стале сядзіць жанчына, — у чорнай скуранай куртцы, са стрыжанымі валасамі, — і курыць папяросу. Праўду кажучы, я ўпершыню ў жыцці тады ўбачыла, каб жанчына курыла, і я крыху збянтэжылася. Але як толькі яна звярнулася да мяне, маёй збянтэжанасці нібы і не было. Мне здалося, быццам блізкі, зусім блізкі чалавек гаворыць са мною. Яна ў мяне распытвала пра ўсё: як я жыву, дзе я жыву і дзе я працавала. Я ўсенька ўсё ёй расказала, як роднай сястры. Выслухаўшы да канца маю «светлую» біяграфію, яна вельмі цёпла на мяне зірнула і сказала: «Добра, таварыш (упершыню да мяне так звярнуліся), вы будзеце працаваць у нас». Я да таго ўзрадавалася, што мне аж захапелася кінуцца да яе і руку пацалаваць. Але яна схавала рукі назад і так усхапілася са свайго месца, нібы хтосьці яе ўкусіў. «Што вы хочаце рабіць?»—спыталася яна з дзівам. Я стаяла слуп-слупам, з апушчанымі вачыма. Мармытнула ў нос «дзякуй» і хацела выйсці з пакоя.

Раптам я адчула, што пара добрых, спагадлівых вачэй утаропіліся ў мае ногі, спыніліся на маіх стаптаных пантоплях з адарванымі падэшвамі, абкручаных аборачкамі. Колькі мы так стаялі лоб-у-лоб, — не ведаю, але яна першая загаварыла.

— Слухайце, — кажа, — таварыш, другіх чаравікаў не маеце?

— Адкуль мне мець? — адказваю, і твар у мяне становіцца гарачы, як агонь.

Жанчына адмахнула пазногцем попел з папяросы, крыху задумалася ды і кажа:

— Вось што, таварыш, я дам вам запісачку, дык вы пойдзеце на наш склад і вам выдадуць пару чаравікаў, бо ў вашых пантоплях нельга працаваць у такія марозы.

«Вось дзіўны чалавек, — думаю, — яшчэ маладых няма, а яна ўжо вяселле гуляе. Ні з таго, ні з сяго — чаравікі!» Але што-ж, калі даюць, дык бяры (так заўсёды маці гаварыла, калі я адмаўлялася браць у суседкі кавалак хлеба задарам) Я ўзяла запіску, пайшла на склад і, — што вы скажаце, — мне зараз-жа далі пару новых чаравікаў. Уявіце сабе, цяпер я не абула-б іх на ногі. Пара цяжкіх юхтовых барлёцаў на драўлянай падэшве. Аднак, тады, як толькі я ўгледзела гэтыя чаравікі, дык схапіла іх у свае рукі, і сэрца маё затахкала, затрапяталася браць у суседкі кавалак хлеба задарам) вікі да грудзей і бягом дахаты, яшчэ раз надзівілася на іх, яшчэ раз пагладзіла, загарнула ў чыстую анучку і запхнула далёка-далёка на паліцу. Схапіла дзяркач, самы лепшы дзяркач у хаце, і пабегла на службу.

У райкоме, трэба вам сказаць, было тады гразі і пылу без канца і меры. Не ведаю, ці да мяне там зусім не было прыбіральшчыцы, ці, можа, яны мелі якую недарэку, гультайку, але гразі было шмат. А я гэтага не цярплю. Словам, не буду вам доўга калатырыць, скінула я з ног свае атопкі, закасала рукавы, узяла дзяркач у рукі як след і давай шараваць, чысціць, скрэбсці, аж пыл і дым закурэў. Не люблю бахваліцца, але, калі раблю ўборку ў пакоях, дык мае рукі адчуваюцца. Адным словам, праз пару гадзін усе пакоі, усё памяшканне было чысцюткае, як золата.

І вось, я ўжо канчаю работу, выціраю на-суха апошні кавалак падлогі, ажно адчыняюцца дзверы і ўваходзіць да мяне тая самая таварышка, якая дала мне ўдзень запіску на чаравікі. Увайшла, кінула вокам туды-сюды і ўзрадавалася.

— Малайчына, Нахама, — кажа, — малайчына.

Я адчуваю, што ад гэтага «малайчыны» па ўсіх маіх жылах і паджылках цяплынь разыходзіцца, і давай яшчэ мацней, яшчэ спрытней выціраць падлогу. Ажно раптам мая новая таварышка як усплясне рукамі, ды як крыкне здзіўленым крыкам:

— Нахама, што-ж вы гэта робіце?

Ануча вышала з маіх рук. Я выпрасталася і стаю аслупянелая. «Ну, — думаю, — Ступа, ты ўжо нешта ўчыніла. Мабыць, ліха, ды не абы якое». Але доўга думаць не прышлося.

— Скажыце мне, — пытаецца таварышка, — хто-ж вам дазволіў босай падлогу мыць?

«Гэта ўсё?» — думаю, і мне адразу палягчэла на сэрцы.

— Што значыць, — кажу, — хто мне дазволіў? А як-жа інакш мыюць падлогу.

Бачу, мая таварышка супакоіцца не можа.

— У такі мароз босай падлогу мыць? Дзе вашы чаравікі? Вы іх не атрымалі?

— Што значыць не атрымала? — кажу. — Атрымала.

—Дык чаму вы іх не абулі?

Тут я ўжо не магла змаўчаць.

— Слухайце, — кажу, — таварышка. Вы гэта жартуеце, ці ўсур'ёз гаворыце? Як-жа гэта я ў новых чаравіках буду падлогу мыць? Ці ведаеце, што гаворыце? Нашаму брату гэта можа зашкодзіць. А наогул, — кажу, — не люблю, калі залішне ўмешваюцца ў гаспадарку. Зусім не ваша справа, як я падлогу мыю, абы падлога была чыстая. Я восемнаццаць год мыла падлогу ў тоўстай Добы і яна мне такіх пытанняў не задавала. Наадварот, калі часам дарыла мне пару сваіх абноскаў, дык загадвала, каб я пільнавала іх, як зяніцу вока.

Я гавару, а мая таварышка за бакі бярэцца ад смеху.

— Ах, Нахама, Нахама! — кажа яна. — Вы яшчэ зусім дурненькая, а ўборку рабіць басанож я вам больш нізашто не дазволю. Каб вы заўтра прышлі сюды ў новых чаравіках, бо больш не «служыце» ў тоўстай Добы, а працуеце ў Совецкай улады, а Совецкая ўлада цэніць людзей, а не чаравікі. Зразумелі?

Праўду кажучы, я тады яшчэ мала што разумела, але мне было так добра ад яе слоў, — адна асалода. Я, здаецца, у той час прыбрала-б яшчэ дзесяць пакояў і не было-б цяжка. Назаўтра я прышла на працу ў новых чаравіках.

Так я працавала там усю зіму. Праца мая спадабалася, бо я не люблю фальшывіць. У мяне такая звычка, калі ўжо што-небудзь рабіць, дык па-сапраўднаму рабіць. Ну, а два разы паўтараць мне адно і тое нікому не прыходзіцца. А калі трэба куды схадзіць, дык я таксама не лянуюся. Словам, бачу, што мною здаволены. А я? Я таго больш здаволена, бо вы-ж разумееце, што пасля восемнаццаці нешчаслівых год, якія я ў тоўстай Добы праводзіла на кухні служанкай, уся цяперашняя работа была для мяне гульнёй. Гэта-ж падумаць толькі, адпрацавала сваё — і вольная птушка. Кладуся спаць. Ніхто мяне не будзіць. Ніхто не лаецца, ніхто не крычыць:

— Ты яшчэ дрыхнеш, Ступачка? Уставай, мая паненка!

Цяпер квіта! Канчаю сваю работу і раблю, што мне ўздумаецца. Сплю, адпачываю, гуляю. А, скажу вам праўду, я ўжо тады пачала па вечарах вучыцца чытаць і пісаць і к канцу зімы ўжо ўмела падпісвацца. Што доўга расказваць, я працавала так у радасці да самай вясны.

Сёмага сакавіка, памятаю як сёння, іду сабе па карыдору і нясу самавар ставіць. Чую, Вера Паўлаўна кліча. Адвярнулася, аж яна мне насустрач ідзе. Тая самая, што чаравікі мне дала. За зіму, павінна вам сказаць, мы так прывыклі адна да другой, што і сказаць вам не магу. Гэта жанчына вечна аба мне клапацілася, дбала, цікавілася. Яна старалася, каб мне жылося як найлепш, каб я працавала як найлягчэй. Дык вы-ж разумееце, што я палюбіла яе, як сваё жыццё. Бо, шчыра кажучы, я да таго часу ні ад каго ў жыцці добрага слова нечуала.

(Працяг на 4-й стар.)

НОВЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ АБ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX СТАГОДДЗЯ

Ворагі народа, беларускія нацыянал-фашысты і трацкісты-бухарынцы, якія доўгі час арудавалі на культурным і літаратурным фронце БССР, арыентыруючыся на капіталістычны Захад, імкнуліся ў сваіх контррэвалюцыйных мэтах утоіць ад нашага народа некаторыя творы як вуснай народнай творчасці, так і пісьмовай беларускай літаратуры.

У гісторыі беларускай літаратуры XIX стагоддзя ворагі народа выстаўлялі на першы план польскіх бяздарных пісьменнікаў-этнографаў — Рыпінскага, Баршчэўскага і іншых, якія прапаведвалі ў сваёй «творчасці» паланізацыю і прыгнечанне беларускага народа панскай Польшчай; разам з тым яны ўтойвалі ад народа сапраўды дэмакратычныя творы беларускай літаратуры, творы, у якіх наш народ пратэставаў супроць каварных польскіх захватчыкаў і апяваў братнюю дружбу з вялікім рускім народам; яны нахабна фальсіфіцыравалі гістарычнае мінулае беларускага народа, гаворачы аб якімсьці ніколі не існаваўшым «залатым веку» — аб тых кашмарных часах, калі беларускі народ знаходзіўся пад страшэнным прыгнётам польска-літоўскіх паноў і магнатаў.

Інстытут літаратуры і мовы Акадэміі навук БССР, працуючы над стварэннем падручніка па беларускай літаратуры, паслаў аўтароў гэтых радкоў у навуковую камандыроўку ў Ленінград з мэтаю адшукання новых матэрыялаў па беларускай літаратуры XIX стагоддзя.

У ленінградскіх архівах і бібліятэках мы змаглі выявіць некаторыя невядомыя арыгінальныя матэрыялы па беларускай літаратуры, якія маюць для нас навуковае і палітычнае значэнне. Разам з тым знойдзен цэлы рад поўвядомых старынных твораў, аб якіх у Беларусі мала хто ведаў, хоць яны і былі надрукаваны.

Сярод знойдзеных матэрыялаў асаблівую цікавасць прадстаўляюць арыгінальныя, яшчэ нідзе не надрукаваныя рукапісы мастацкіх твораў на беларускай мове: 1) «Панская ласка» — ананімная паэма аб прыгонніцкім ладзе, у якой даецца рэзкая крытыка паноў-прыгоннікаў; 2) «Воскресение христово и сошествие его в ад» — ананімны парадыйны твор, які нагадвае сабою беларускую паэму «Тарас на Парнасе». Калі ў паэме «Тарас на Парнасе» парадыруюцца грэчаская і рымская міфалогія і дваранскія густы, дык у гэтым творы рэзка высмейваецца біблія, крытыкуецца рэлігія; 3) «Сцяпан і Тацяна» — бытавая паэма аб жыцці беларускага сялянства, напісаная селянінам Марозам. Гэта паэма надрукавана была ў газеце «Минский листок» за подпісам Шункевіча. На самай справе, як цяпер відаць з рукапісу, гэту паэму напісаў не Шункевіч, а селянін Менскай губерніі. Наступны рукапісны твор — п'еса «Адвячорак», напісаная Сазановічам, паказвае быт прыгоннага сялянства.

Апрача гэтых арыгінальных рукапісных твораў, яшчэ нідзе не друкаваных, намі знойдзен рад ананімных «гутарак» рэвалюцыйна - дэмакратычнага характару: «Дзядзька Антон або гутарка аб усім чыста, што баліць, а чаму баліць — не ведам», «Гутарка Данілы са Сцяпанам»; «Гутарка Паўлюка»; «Хто праўдзівы прыяцель беднага народа»; «Гутарка аб тым, куды мужыцкія грошы ідуць»; «Як зрабіць, каб людзям стала добра на свеце»; «Гутарка Кузьмы з Апанасам» і інш. Некаторыя з «гутарак» друкаваліся толькі ў Лондане і Парыжы.

Усе гэтыя «гутаркі» уяўляюць своеасаблівы літаратурны жанр **мастацкай публіцыстыкі.** У іх арганічна спалучаны элементы мастацкасці з публіцыстычнай прапагандай палітычных, рэвалюцыйных ідэй, накіраваных супроць самаўладства, як асноўнага сацыяльнага зла. Мова гэтых «гутарак» з'яўляецца народнай беларускай мовай; яна каларытная і сакавітая. Сам жанр «гутарак» у гісторыі беларускай літаратуры XIX стагоддзя займае досыць вялікае месца і патрабуе свайго даследвання і вывучэння.

З друкаваных матэрыялаў на беларускай мове знойдзены такія рэдкія творы, як зборнік «Расказы на беларускім нарэччы», сярод якіх асаблівую цікавасць прадстаўляюць: «Казка не казка, быль не быль, але так бывае», «Вялікая памылка нашых беларусоў». Гэтыя апавяданні накіраваны супроць панскай Польшчы, якая доўгі час прыгнятала беларускі народ. Таксама знойдзены гістарычныя і міфалагічныя песні: «Быў на Русі чорны бог», «З-за Слуцка, з-за Клецка», «А калі-б, калі маскалі прышлі», якія надрукаваны ў зборніку 1839 года і таксама накіраваны супроць панскай Польшчы. У іх паказваецца векавечная дружба беларускага народа з рускім.

У Ленінградскім архіве Унутранай палітыкі, культуры і быту СССР знойдзены: справа Дуніна-Марцінкевіча аб выданні п'есы «Пінская шляхта», забароненай цэнзурным камітэтам міністэрства унутраных спраў, таму што там высмейваліся чыноўнікі; справа Багушэвіча, у якой цэнзурны камітэт спасылаецца на невядомы нам зборнік Багушэвіча «Беларускія расказы М. Бурачка», — гэты зборнік, як відаць з адносіны цэнзурнага камітэта, забаронен таму, што ў ім былі творы, накіраваныя супроць царскага ўрада. Тут-жа знойдзена справа цэнзурнага камітэта аб забароне друкаваць рукапіс на беларускай мове «Беларуская ластаўка», напісаны студэнтам Паленкоўскім. Характэрнымі з'яўляюцца таксама справы цэнзурнага камітэта адносна рэакцыйных твораў Блуса і Аляксандра Ельскага. Творы гэтых пісьменнікаў цэнзурным камітэтам былі дазволены да друку.

Значную цікавасць прадстаўляюць знойдзеныя новыя вершы Багушэвіча і Янкі Лучыны. У надрукаваным на папяроснай паперы зборніку «Песні», у якім змешчаны вядомыя творы Багушэвіча, ёсць тры вершы, якія да гэтага часу не былі нам вядомы. Гэтыя вершы безумоўна належаць Багушэвічу. Яны цалкам супадаюць з мастацкімі асаблівасцямі творчасці паэта і на гэтай падставе адносяцца намі да ліку невядомых твораў Багушэвіча. Да гэтага часу не былі вядомы такія творы Янкі Лучыны, як «Па поваду стогадовай гадавіны з дня нараджэння лорда Байрана», «Не ради славы иль расчета», «Вясна», «У памяць бенефіса» і «Роднай старонцы», якія не ўвайшлі ў яго зборнік «Вязанка».

Апрача гэтых літаратурных матэрыялаў, намі знойдзены некаторыя матэрыялы фальклорнага характару. Сярод іх першае месца займаюць рукапісы нідзе не друкаваных беларускіх казак, легенд поўбыліннага характару і песень. Некаторыя з іх мы перапісалі. Значную цікавасць прадстаўляе легенда «Пра мужыка Ерафея, яго жонку і сына Фаму», якая нагадвае аповесць старой рускай літаратуры «О горе-злосчастье». Легенда «Пчолы», поўбыліны «Асілкі» і «Чортаў мост» з'яўляюцца надзвычай цікавымі і характэрнымі творамі беларускага эпасу. Таксама знойдзены дзве песні, якія нідзе яшчэ не былі надрукаваны, але маюць пэўнае дачыненне да творчасці Ф. Багушэвіча і Я. Купалы.

Сярод друкаваных, але мала вядомых матэрыялаў намі выяўлена значная колькасць помнікаў беларускага герaічнага эпасу. Частку гэтых твораў мы перапісалі для выдання асобнага зборніка альбо хрэстаматыі па фальклору. Вельмі цікавымі з'яўляюцца такія творы беларускага гераічнага багатырскага эпасу, як «Кара ў сто лет», «Кацігарошак», «Сем сыноў і сястра», «Нязнайка», «Адзенюк», «Хлопец і дзяўчынка», «Развалігара, Развалімуры, Зламіжалеза», «Смок», «Аб цыгану, які змея ашукаў». «Аб жалезным ваўку», «Аб чалавеку з жалезным носам», «Аб цыгану, як ён забіў змея», «Аб змеях страшэнных» «Праз Ілюшку», «Аб Когцю» і інш. Усе гэтыя творы належаць да багатырскага эпасу, які шырока развіваўся ў вуснай творчасці беларускага народа даўнейшых часоў.

Звычайна ў пералічаных творах беларускага эпасу, які безумоўна створан пад уплывам рускіх былін, даюцца вобразы змея альбо злога чалавека, увасабляючых сабою ворагаў народа, і вобраз багатыра, увасабляючага сабою сілу, мужнасць, дабрату, гераізм, вынослівасць і іншыя высокія якасці народа. Гэты вобраз багатыра ў названых творах з'яўляецца вельмі цікавым і высокамастацкім. Тут народ увасобіў сваю барацьбу з ворагамі, якія доўгі час прыгняталі працоўных. У гэтых творах багатыр заўсёды вядзе барацьбу з рознымі несправядлівасцямі і парокамі сацыяльнага жыцця. Ён вытрымлівае вялікія цяжкасці ў барацьбе і заўсёды перамагае змея, перамагае ворага і зло.

Настаў час, калі патрэбна сур'ёзна прыступіць да вывучэння і выдання твораў гераічнага эпасу беларускага народа. Доўгі час распаўсюджвалася думка, што гэтага эпасу ў Беларусі не было. Але гэта не так. Беларускі народ, які разам з рускім народам на працягу некалькіх вякоў вёў барацьбу супроць агульнага ворага, ствараў і адпаведныя творы багатырскага эпасу, у якіх паказаў сваю сілу, свае здольнасці, сваю непераможнасць, сваю веру ў светлае, шчаслівае жыццё.

І, нарэшце, трэба сказаць некалькі слоў аб творы «Плач белорусской земли». Гэты твор быў надрукаван у 1894 годзе. Асобным адбіткам ён уваходзіў у зборнік «Смесь». Аб гэтым творы ведалі далёка не ўсе нават спецыялісты. Аб ім ніколі не гаварылі і не пісалі, не гледзячы на тое, што ён надрукаван асобным адбіткам.

«Плач белорусской земли» напісан на рускай мове і ўяўляе цікавасць для нас тым, што ён накіраван супроць панскай Польшчы, якая на працягу некалькіх стагоддзяў прыгнятала і імкнулася прыгнятаць беларускі народ. У гэтым творы выносіцца смяротны прыгавор здраднікам беларускага народа, яго рэнегатам — «беларусам-католікам», як называюцца яны аўтарам, якія добраахвотна перайшлі на бок Польшчы і каталіцтва, здрадзіўшы тым самым беларускаму і рускаму народам. Тут, можа быць, аўтар «Плача белорусской земли», напісаўшы яго ў канцы XIX стагоддзя, мае на ўвазе гістарычнае мінулае, калі Польшча гвалтоўна захапіла Беларусь і падвергнула беларускі народ дзікай паланізацыі (канец XVI і XVII стагоддзяў). У гэты час, як вядома, траплялiся сярод беларусоў асобныя людзі, што добраахвотна пераходзілі на бок палякаў. Магчыма, што іменна гэты гістарычны факт аўтар мае на ўвазе ў разглядаемым творы. Твор «Плач белорусской земли» з'яўляецца ананімным. Ён яшчэ патрабуе свайго даследвання, належных навуковых каментарыяў. Але як-бы там ні было, а адно для нас зусім ясна, што твор гэты, прасякнуты ідэяй нацыянальнай гордасці і адзінства беларускага і рускага народаў, звязаных ніцямі векавой братняй дружбы, накіраван супроць здраднікаў народа і радзімы.

Усё зробленае намі за час навуковай камандыроўкі ў Ленінградзе па адшуканню новых матэрыялаў па беларускай літаратуры — толькі пачатак вялікай работы. Навуковым работнікам інстытута літаратуры і мовы, фальклорнай секцыі і Акадэміі навук БССР, а таксама секцыі крытыкаў ССП БССР трэба ў далейшым сур'ёзна ўзяцца за адшуканне старажытных матэрыялаў па беларускай літаратуры. Гэтыя матэрыялы ёсць. Яны знаходзяцца ў розных архівах і музеях. Нам, напрыклад, толькі ў Ленінградзе стала вядома, што ў маскоўскіх архівах таксама ёсць матэрыялы па беларускай літаратуры. У асабістым архіве Срэзнеўскага, які перададзен з Ленінграда ў Маскву, ёсць беларускія, яшчэ нідзе не апублікаваныя казкі, легенды і быліны. Гераічны эпас беларускага народа, існаванне якога да гэтага часу адмаўлялася, мае сваё пэўнае месца ў беларускім фальклоры. За вывучэнне і выданне ўзораў беларускага багатырскага эпасу патрэбна ўзяцца з усёй сур'ёзнасцю. Таксама трэба ўзяцца за адшуканне ў архівах матэрыялаў па старажытнай беларускай літаратуры. Над гэтым яшчэ ніхто як след не працаваў.

Кандыдаты філалагічных навук:

М. ЛАРЧАНКА,
Л. ФІГЛОЎСКАЯ.

ПЕРШАЯ ПРЭМІЯ

(КАНЕЦ)

Я адразу спынілася.

— Нахама, — кажа яна, — ведаеш, што заўтра восьмае сакавіка?—Яна ўжо гаварыла са мной на «ты».

— Ведаю, чаму-б мне не ведаць. Гэта-ж наша свята, — кажу з нейкай дзіўнай гордасцю.

— Так, Нахама, — кажа яна, — наша свята. Сёння ўвечары агульнагарадскі сход жанчын, ведаеш?

— Ведаю, — кажу, — білет маю.

— Глядзі, — кажа яна, — каб не спазніцца. Там будзе цікава. Будуць прэміраваць тых, хто заслужыў. Пры гэтым яна мне неяк дзіўна міргнула вокам.

У той дзень я адпрацавала свае лепш, чым у іншыя дні. А як толькі надышоў вечар — памылася я, апранулася ва ўсё лепшае і пабегла на сход у тэатр. Увайшоўшы ў тэатр, я спынілася і дзіву далася: гэткая зала, гэтулькі народу, гэтулькі святла і гэтулькі крэслаў! Музыка грае. Дзяўчаты і жанчыны спяваюць. Хоць ты сама заспявай. Але, па-першае, мне сорамна, а па-другое, яны спяваюць такія прыгожыя, новыя, вясёлыя песні. Я крыху пастаяла, азіраючыся, і села ў кутку ў апошніх радах. Не люблю вытыркацца наперад. Пасядзела крыху, аж раптам як зазвоніць званок. На сцэну выйшла жанчына, адкрыла ўрачысты вечар. Выбралі прэзідыум і пачаўся сход. Перш-на-перш далі слова Веры Паўлаўне. Ну, і гаварыла яна — заслухацца можна было, шчыра кажу. Яе прамову я тады яшчэ мала разумела, але, калі ўсе пачыналі апладыраваць, дык я пляскала ў далоні гучней і больш за ўсіх. Пасля яе гаварылі яшчэ некалькі жанчын, потым прыступілі да раздачы прэмій.

Нейкія дзве таварышкі прынеслі на сцэну шмат розных рэчаў. Жанчына, што кіравала сходам, вычытвала з паперы, каго прэміруюць, чым прэміруюць і за што прэміруюць, і таварышка выходзіла на сцэну і атрымлівала прэмію. Вы-ж ведаеце, як гэта заўсёды робіцца. Для мяне гэта было так нова і цікава, што я вачэй адарваць не магла ад сцэны.

Першай прэміравалі работніцу з фабрыкі — жакеткай, за ёй настаўніцу — кнігамі. Пасля зноў работніцу — чаравікамі, а раптам, чую, чытаюць:

— За добрую, адданую працу і за ліквідацыю непісьменнасці прэміруецца палітом работніца райкома Нахама Флакс. «Ліханька, — думаю, — няўжо гэта маюць на ўвазе маю асобу»? Сэрца загрукатала так моцна, нібы яму цесна стала сядзець са мною на адным крэсле. Але я не паддалася. «Ступа, — думаю сабе, — ты ўсё-ж такі ступа. За што якое будуць цябе прэміраваць»? Я-ж тут нічога асаблівага не зрабіла. Гэта-ж, бывала, я ў тоўстай Добы за адну ноч спраўлялася бялізну пасціраць, пасінькаваць, пакрухмаліць і развесіць да апошняй штукі. Да дзевяці раніцы ва ўсіх сямі пакоях ужо ўсё зіхацела. Падлога была памытая, жоўтая, як той жаўток. Самавар кіпеў на стале такі начышчаны, хоць глядзіся ў яго, як у люстэрка. Шклянкі прасвечваліся, нібы крышталь. А паранае малако было чырвонае і тлустае з плеўкай у палец таўшчынёю. Аднак, ніколі ў жыцці мяне не прэміравалі. А тут, ні села, ні пала, — на табе прэмію! «Не, не можа быць, — думаю, — гэта памылка».

Так я сабе сяджу, ды сама з сабою разважаю. І не агледзелася, як Вера Паўлаўна апынулася ля мяне.

— Нахама, — кажа, чаго-ж ты сядзіш? Чаму не ідзеш атрымаць сваю прэмію, паліто? Гэта-ж сорам, кажа яна, — сход затрымліваеш.

— Якую прэмію? — кажу. — Якое паліто? Што вы гаворыце?

— Твая прэмія, — кажа яна, — тваё паліто. Ідзі, забяры. Ты заслужыла.

Павяла яна мяне на сцэну, як маладую пад вянец. Мне сорамна было на людзей глядзець. Калі ў маіх руках апынулася паліто, мне здавалася, што гэта сон... Баялася, што, вось, прачнуся і паліто знікне. Пасля, калі я крыху ачухалася, дык адчула, што нешта незвычайнае чыніцца са мною. Я адчула, што раблюся маладой, нованароджанай радаснай, шчаслівай. Мне раптам захацелася крычаць, гаварыць, апавядаць пра ўсё-ўсё, выказаць з самага сэрца пра сваё жудаснае ранейшае жыццё, каб сэрца засталося чыстае, новае, як паліто, якое ўпершыню ў маім жыцці ляжыць на маіх спрацаваных руках. Я крыкнула: «Таварышы!..» І больш слова сказаць не магла, расплакалася і сыйшла са сцэны.

Хочаце ведаць, чым гэта кончылася?

Выйшла так, што з таго часу не стала Нахамы Ступы: знікла, нібы ў ваду канула. На яе месцы вырасла Нахама Флакс, якую зноў перарабіць на Нахаму Ступу ўжо нікому не ўдасца.

Пераклаў з яўрэйскай мовы
З. БЯДУЛЯ.



Да 125-годдзя з дня нараджэння Т. Г. Шэўчэнка. НА ЗДЫМКУ: афорт работы Т. Г. Шэўчэнка «Жабрак на магілках».

Рэпрадукцыя фотахронікі ТАСС.

20-годдзе Ленінградскага малага опернага тэатра

У азнаменаванне 20-годдзя Ленінградскага малага опернага тэатра, дзе нарадзіліся выдатныя новыя савецкія оперы «Ціхі Дон» і «Паднятая цаліна», у Ленінградзе была праведзена юбілейная дэкада. У часе дэкады былі паказаны лепшыя прэм'еры тэатра за 1937, 1938 і 1939 годы — оперы «Маці» В. В. Жэлабінскага, «Мяцеж» Л. Ходжа-Эйнатава, «Паднятая цаліна» і «Ціхі Дон» І. Дзяржынскага, «Кола Бруньён» Д. Кабалеўскага, «Прададзеная нявеста» Б. Сметана, балет «Каўказскі нявольнік» Б. Асаф'ева і інш.

—⊙—

ГІСТОРЫЯ РУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

У Інстытуце гісторыі Акадэміі навук СССР і яго ленінградскім аддзяленні пачата вялікая работа па складанню капітальнай трохтомнай Гісторыі рускай культуры. У ёй будзе паказан шлях развіцця рускай навукі, асветы, літаратуры, выяўленчых мастацтваў, тэатра, музыкі і г. д.

Работа вядзецца адначасова над трыма томамі з тым, каб ужо ў гэтым годзе на-чарна закончыць гэту першую гісторыю культуры вялікага рускага народа.

А. МАІСЕЕЎ.

—⊙—

КОНКУРС НА ЛЕПШАГА ЧЫТАЛЬНІКА

Менская абласная алімпіяда мастацкай самадзейнасці паказала, што жанр мастацкай чыткі адстае ад іншых жанраў самадзейнасці. Сярод 1.500 удзельнікаў алімпіяды было толькі 7 чытальнікаў.

Для пашырэння гэтага жанра і выяўлення чытальнікаў мастацкага слова Аргкамітэт Вярхоўнага Совета БССР па Менскай вобласці пастанавіў правесці абласны конкурс на лепшага чытальніка. Конкурс адбудзецца з 27 па 30 красавіка 1939 года. Абласному конкурсу будуць папярэднічаць раённыя конкурсы з 1 па 20 красавіка.

Абласны аддзел па справах мастацтваў арганізуе ў дапамогу чытальнікам кансультацыю і рассылае ім рэкамендацыйныя спісы твораў.

Для прэміравання лепшых чытальнікаў асігнавана 3 тысячы рублёў.

БІБЛІЯГРАФІЯ

ЦІКАВАЯ АПОВЕСЦЬ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Пад скромнай назвай «Курылка» празаік М. Цэлеш некалькі год назад напісаў змястоўную, цікавую аповесць для дзяцей. Аповесць гэта выйшла ўжо другім выданнем.

У сваім творы аўтар расказвае пра годы ўласнага маленства, пра вучобу ў сельскай царкоўна-прыходскай школе.

Школа змяшчалася ў больш горшым будынку, чым нават карчма. «Наша школа стаяла на пустыры, сярод вёскі. Гэта была старая, крытая цёсам будыніна. Калісь у ёй была карчма. Потым карчму зрабілі новую, а для школы ўзялі стары будынак» — так апісвае аўтар школу, у якой яму прышлося навучацца.

Настаўнікам у школе быў пан Курылін, якому вучні надалі мянушку «Курылка». Гэта быў чалавек малаадукаваны, грубы. «Азы» і «букі» ён укалачваў у галовы сваіх выхаванцаў лінейкай «па лапе». І нездарма маткі страшылі сваіх дзяцей: «От, пачакай-жа! Пойдзеш у школу — абдзярэ табе вушы настаўнік!»

Праўда, у царкоўна-прыходскую школу траплялі і такія настаўнікі, як Вера Аляксандраўна, якія «імкнуліся наладзіць нейкую працу і з дарослымі, з бацькамі вучняў». Толькі на першыхжа нясмелых і няўпэўненых кроках іх груба абрывалі поп, ураднік, і пасля выкліку «да начальства» яны ўжо больш не вярталіся ў вёску. А «Курылкі» заставаліся ў школе калечыць разумных, дапытлівых дзяцей, якія звычайна пасля сканчэння школы «зрэзаліся» на экзаменах і ішлі ў пастухі.

Такі шлях Мацвея і хлопчыка, ад імя якога аўтар вядзе апавяданне.

Разумны і дапытлівы хлопчык Мацвей падаецца аўтарам праўдзіва, цёпла. Мацвей меў вялікія здольнасці да навукі, імкнуўся пазнаць невядомае, страсна любіў прыроду; яго дапытлівы розум хацеў раскрыць таямніцы прыроды. Ва ўмовах савецкай школы з Мацвея, безумоўна, выйшаў-бы сур'ёзны прыродазнавец, буйны вучоны, даследчык багатых прыродных скарбаў нашай краіны. А ці магла даць гэта царкоўна-прыходская школа на чале з «Курылкам»!

«Чым больш біў яго «Курылка», тым горш ён вучыўся, тым больш розных штук вырабляў» — малюе аўтар узаемаадносіны настаўніка і вучняў.

Не давучыўшыся, Мацвей кінуў школу, якая давала дзецям не радасць і задавальненне, а пакуты і здзекі, якая ламала, каверкала іх псіхіку.

З праўдзівага, рэалістычнага твора «Курылка» перад дзецьмі ва ўсю сілу ўстае рэзкі кантраст паміж сучаснай, савецкай школай і старой царкоўна-прыходскай школай, гэтай своеасаблівай вясковай бурсай.

І таму так патрэбны, актуальны мастацкія творы на гэту тэму. А дарэвалюцыйная і яшчэ больш савецкая школа ў беларускай мастацкай літаратуры адлюстраваны надзвычай мала.

Твор «Курылка» мае пазнавальнае значэнне не толькі для савецкіх дзяцей, але і для педагогаў.

Простая і сакавітая мова твора, веданне псіхікі дзіцяці школьнага ўзросту, а галоўнае — цеплыня ў адлюстраванні дзяцей, любоў да іх, што пранізвае ўвесь твор, дазваляе нам меркаваць, што аўтару патрэбна і надалей пісаць аб дзецях.

М. КАРПАЧОЎ.

НАРАДА ПАЧЫНАЮЧЫХ ПІСЬМЕННІКАЎ МАГІЛЕЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Па ініцыятыве праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і рэдакцыі газеты «Комунар Магілеўшчыны» у гор. Магілеве 1—3 сакавіка праведзена абласная нарада-канферэнцыя пачынаючых аўтараў. У нарадзе прымалі ўдзел 36 маладых пісьменнікаў — паэтаў, празаікаў, драматургаў Магілеўскай вобласці. Ад Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР у нарадзе прымалі ўдзел тт. Клімковіч, Якімовіч і Бярозкін.

Вялікі даклад аб становішчы і задачах беларускай савецкай літаратуры і становішчы работы з маладымі пісьменнікамі зрабіў тав. Клімковіч. З дакладамі аб творчасці маладых паэтаў і празаікаў Магілеўшчыны (Кашляк, Гарулёў, Рашкоў, Валасевіч, Волкаў і інш.) выступілі т.т. Якімовіч і Бярозкін. Пасля дакладаў разгарнуліся цікавыя спрэчкі, у якіх выступіла большасць дэлегатаў нарады.

Амаль усе таварышы, якія прымалі ўдзел у спрэчках, выказвалі нездаволенасць становішчам, у якім знаходзіцца работа з пачынаючымі аўтарамі на перыферыі. Кансультацыя, якая даецца рэдакцыяй газеты «Комунар Магілеўшчыны», не задавольвае большасці маладых аўтараў. Выступаючыя таварышы скардзіліся і на тыя, часам неахайныя, пагардлівыя адказы, якія маладыя пісьменнікі атрымоўваюць ад рэдакцый рэспубліканскіх журналаў і газет («Полымя Рэволюцыі», «Літаратура і Мастацтва», «Чырвоная Змена» і інш.).

Выступаўшыя таварышы адзначылі таксама, што газета «Літаратура і Мастацтва» амаль зусім не змяшчае аглядаў літаратурных старонак абласных газет. Пачынаючыя пісьменнікі тт. Гарулёў, Станкевіч і інш. выказалі пажаданне, каб пры Саюзе савецкіх пісьменнікаў БССР былі арганізаваны абласныя камісіі, якія-б займаліся пытаннямі росту маладых пісьменніцкіх кадраў перыферыі.

Пасля нарады адбыўся агульнагарадскі літаратурны вечар. Удзельнікі нарады калектыўна прагледзелі ў Рускім тэатры спектакль «Таня» Арбузова.

Г. Б.

У ГОНАР 8 САКАВІКА

Праўленне Саюза савецкіх мастакоў БССР арганізуе ў гонар Міжнароднага Комуністычнага Жаночага Дня выстаўку работ жанчын-мастакоў Ізергінай, Дакальскай, Здаsucceeded Здаsucceeded

Мастакі БССР зрабілі ўжо 12 партрэтаў стаханавак нашых соцыялістычных прадпрыемстваў.

КАНЦЭРТЫ Ў МЕНСКУ

З 5 па 10 сакавіка ў Менску праходзяць канцэрты Дзяржаўнай яўрэйскай капелы УССР «Евоканс» пад мастацкім кіраўніцтвам засл. арт. УССР кампазітара І. П. Шэйніна. У праграме капелы — песні народаў СССР, творы савецкіх кампазітараў і класіка.

***

10 сакавіка ў клубе імя [illegible]ліна адбудзецца вялікі канцэрт, [illegible]расвечаны XVIII з'езду ВКП(б). У канц[illegible] прымуць удзел хор, ансамбль пес[illegible] п[illegible]скі, аркестр народных інструмента[illegible] [illegible]армоніі, салісты — засл. арт. рэ[illegible] [illegible]ксеева, лаўрэат усесаюзнага кон[illegible] [illegible]крыпачоў Амітон, дацэнт [illegible]рваторыі Клумаў, удзельніца ўсесаюзн[illegible] конкурса вакалістаў Руч'ёва і інш.

***

18 сакавіка ў клубе імя С[illegible]ліна адбудзецца канцэрт, прысвеча[illegible]ню Парыжскай Комуны. У прагр[illegible] «Эгмонд» Бетховена (маналог Эгмонд[illegible] [illegible]ае засл. арт. рэсп. Рахленка), увер[illegible] Вітольфа, фінал 9-й сімфоніі Бетхове[illegible].

У канцэрце прымуць у[illegible] [illegible]фанічны аркестр, салісты і хор Фі[illegible].

—⊙—

ЗА БЕЗГАСПАДА[illegible] І ПАРУШЭННЕ ДЫСЦ[illegible]НЫ — ПАД СУД

Дырэктар Слуцкага ка[illegible]-соўгаснага тэатра Бергер за безгаспадарчасць і нераспарадчас[illegible] за невыкананне плана, грубае парушэнне фінансавай дысцыпліны і нерашучую барацьбу за ўмацаванне працоўнай дысцыпліны Упраўленнем па справах мастацтваў зняты з работы і прыцягну[illegible] да судовай адказнасці.

ПАПРАЎКА

У газеце «Літаратура і Мастацтва» № 5 ад 27 студзеня г. г. у артыкуле «У драмсекцыі ССП БССР» адносна новай п'есы, над якой працуе тав. Паслядовіч, была дадзена няправільная інфармацыя.

Паводле заявы самога тав. Паслядовіча, работнікі Віцебскага драмтэатра дапамагаюць яму сваёй кансультацыяй у рабоце над новай п'есай.



„КАБЗАР" Т. Г. ШЭЎЧЭНКА НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Белдзяржвыдавецтва закончыла друкаваннем збор вершаваных твораў Тараса Грыгоравіча Шэўчэнка «Кабзар» на беларускай мове. Кніга надрукавана ў колькасці 10 тысяч экземпляраў, палова іх на лепшай паперы. Памер «Кабзара» 38 друкаваных аркушаў, кошт 18 і 20 рублёў. У кнізе партрэт аўтара, 9 ілюстрацый, рад застаўак і канцовак работы ленінградскага мастака Б. Каплана.

ПЛАН ГАСТРОЛЕЙ РЭСПУБЛІКАНСКІХ ТЭАТРАЎ БССР

Упраўленне па справах мастацтваў зацвердзіла план гастролей рэспубліканскіх тэатраў БССР унутры і за межамі БССР на 1939 год. Віцебскі Белдзярждрамтэатр наведае ў маі Гомель, у чэрвені і ліпені — УССР, у жніўні — Менск. Яўрэйскі тэатр будзе выступаць у маі ў Гомелі, у чэрвені, ліпені і жніўні—у УССР. Тэатр музкамедыі да 1 сакавіка гастраліраваў у Сочы, сакавік і красавік правядзе ў Бабруйску, май і палову чэрвеня — у Віцебску, другую палову чэрвеня і жнівень—у Менску. Тэатр юнага гледача ў сакавіку будзе гастраліраваць у Бабруйску, у красавіку—у Гомелі, у маі—ў Магілеве. Рускі драмтэатр наведае ў маі Бабруйск, у чэрвені і ліпені — Гомель.

ПРАЕКТ ГОМЕЛЬСКАГА ТЭАТРА

Работнік «Тэапраекта» (Масква) архітэктар Мельнікаў прадставіў ва Упраўленне па справах мастацтваў праект пабудовы тэатра ў Гомелі на 800 месц, коштам 4,5 млн. рублёў. Аб'ём тэатра — 38.700 куб. метраў.

6 сакавіка адбыўся прагляд праекта спецыялістамі Менска і Гомеля. Праект ухвален.

Тав. Мельнікаў выехаў у Гомель для абмеркавання праекта з гомельскай грамадскасцю.

НОВЫЯ РАБОТЫ МАСТАКА АЛЬПЕРОВІЧА

Нядаўна ў Менску, у доме па Комуністычнай, 36, выпадкова знойдзена значная колькасць невядомых работ памёршага ў 1913 годзе мастака Альперовіча, вучня Рэпіна. Работы прадстаўляюць вялікую цікавасць і значна пашыраюць уяўленне аб выяўленчым мастацтве дарэвалюцыйнай Беларусі.

Упраўленне па справах мастацтваў разам з Саюзам мастакоў прыводзіць гэтыя работы ў парадак і ў канцы красавіка арганізуе выстаўку твораў Альперовіча. Частка іх будзе ў далейшым экспаніравана ў Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Калектыў рэдакцыі газеты «Літаратура і Мастацтва» выказвае сваё глыбокае спачуванне супрацоўніку рэдакцыі А. АСТРЭЙКА з прычыны заўчаснай смерці яго брата.

Дырэкцыя і мясцком Дзяржаўнага тэатра лялек БССР з жалем паведамляюць аб смерці лепшага таварыша, каштоўнейшага работніка — скульптара тэатра К. М. НЕССОНАВАЙ, паследаваўшай 7 сакавіка г. г. у 5 гадз. 32 мін., і выказваюць спачуванне мужу і бацькам нябожчыцы.

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № Ц—924